Падпіска-2007
**СА «ЗВЯЗДОЙ» — У ЧАЦВЁРТЫ КВАРТАЛ**
ІДЗЕ ПАДПІСКА НА 4-Ы КВАРТАЛ 2007 ГОДА.
ПАДПІСНЫЯ ЦЭНЫ НА ГАЗЕТУ «ЗВЯЗДА»
(у рублях, устаноўлены з 01.07.2007 г.)

| Індэкс | на 1 месяц | на 3 месяцы |
|---|---|---|
| 63850 (індывідуальны) | 8200 | 24600 |
| 63145 (індывідуальны льготны, для пенсіянераў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны) | 7850 | 23550 |
| 63858 (ведамасны) | 13000 | 39000 |
| 63239 (ведамасны льготны для ўстаноў міністэрстваў культуры, адукацыі і аховы здароўя) | 11850 | 35550 |

СПАДЗЯЁМСЯ НА ВАШУ ПАДТРЫМКУ, паважаныя падпісчыкі і работнікі паштовай сувязі.

Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
31 ЖНІЎНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА
№ 163 (26028)
Кошт 440 рублёў
ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Аляксандр Лукашэнка:
## «З 2008 года павінна пачацца забудова тэрыторыі беларускага ПВТ»

**Перспектывы развіцця і забудовы тэрыторыі беларускага Парку высокіх тэхналогій абмяркоўваліся 30 жніўня на нарадзе ў Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі.**

Парк высокіх тэхналогій (ПВТ) створаны дэкрэтам Прэзідэнта ад 22 верасня 2005 года № 12. Статут адміністрацыі ПВТ зацверджаны ўказам кіраўніка дзяржавы 31 студзеня 2006 года. Гэты важны праект рэалізуецца пад патранатам Прэзідэнта Беларусі.

Адкрываючы нараду, Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што тэмпы развіцця беларускага аналага знакамітай Сіліконавай даліны пакуль што яшчэ невысокія.

Паводле яго слоў, адказныя за праект асобы заяўляюць «аб фантастычных поспехах у станаўленні Парку высокіх тэхналогій». Аднак, на думку Прэзідэнта, неабходна больш узважана і цвяроза прааналізаваць рэальны стан спраў і заслухаць альтэрнатыўныя думкі. «Папярэджваю аб недапушчальнасці вольнага тлумачэння поспехаў у рабоце Парку высокіх тэхналогій. Усё павінна быць дакладна і даказальна», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як праінфармаваў Прэзідэнта дырэктар адміністрацыі ПВТ Валерый Цапкала, у парку зарэгістраваны 29 кампаній, 1 індывідуальны прадпрымальнік, зарэгістравана 6 бізнэс-праектаў у сферы новых і высокіх тэхналогій. 60 працэнтаў прадпрыемстваў — беларускія, 27 працэнтаў — замежныя, 13 працэнтаў — сумесныя.

У парку, паводле стану на 1 ліпеня 2007 года, працавалі 3 260 чалавек. 65 працэнтаў з іх — моладзь ва ўзросце да 30 гадоў. Даходы, атрыманыя ў выніку прадастаўлення рэзідэнтам ільгот, былі накіраваны на пашырэнне вытворчасці і стварэнне больш як 1 300 новых рабочых месцаў (на долю моладзі тут прыпадае 98 працэнтаў).

Паводле даных статыстыкі, у першым паўгоддзі 2007 года рэзідэнтамі ПВТ выраблена тавараў і паслуг на суму больш за Br50 млрд (у 2,7 раза больш у параўнанні з аналагічным перыядам 2006 года). У выніку ў бюджэт у якасці плацяжоў пералічана Br6,2 млрд. Большасць прадукцыі ПВТ — 82,5 працэнта — экспартуецца. На жаль, попыт айчынных спажыўцоў на прадукцыю рэзідэнтаў ПВТ пакуль невялікі, аднак эксперты прагназуюць яго штогадовы рост.

Беларускі ПВТ супрацоўнічае з буйнейшымі сусветнымі кампаніямі, замежнымі банкамі. Кампаніі-рэзідэнты Парку высокіх тэхналогій актыўна інвестуюць у сістэму адукацыі краіны, у беларускіх ВНУ створана 12 спецыялізаваных лабараторый. Як было адзначана, апошнім часам у Беларусі расце прэстыжнасць спецыяльнасцяў у сферы высокіх тэхналогій.

Валерый Цапкала таксама выказаўся на карысць стварэння ў Беларусі IT-акадэміі, што садзейнічала б перападрыхтоўцы кадраў на больш высокім узроўні і павышэнню кваліфікацыі спецыялістаў.

Прэзідэнту ў час нарады былі прадстаўлены два архітэктурныя праекты забудовы тэрыторыі Парку высокіх тэхналогій. Праект коштам 500 млн еўра, распрацаваны з удзелам замежных экспертаў, прадугледжвае размяшчэнне вытворчых аб'ектаў, офісаў, жылых будынкаў і сацыяльнай інфраструктуры на тэрыторыі плошчай каля 550 тыс. кв.м.

Другі, больш кампактны варыянт на 250 тыс. кв.м ацэньваецца 250 млн еўра. Паводле слоў Прэзідэнта, неабходна ў бліжэйшы час дапрацаваць праект забудовы парку. На яго думку, класічная шматпавярховая забудова з'яўляецца найбольш аптымальнай і выйгрышнай, паколькі зручная для жыццядзейнасці людзей і дае магчымасць прыстасоўваць да розных умоў дзейнасці IT-кампаній. Разам з тым, сутнасць ПВТ — перадавыя, высокія тэхналогіі, таму наяўнасць некалькіх цікавых па архітэктурнаму выкананню будынкаў з элементамі hi-tech будзе ў гэтым выпадку несумненным плюсам.

Паводле слоў прэм'ер-міністра Сяргея Сідорскага, стварэнне ПВТ можа быць завершана на працягу семі гадоў. У час нарады абмяркоўвалася таксама пытанне крыніц фінансавання будаўніцтва і прыцягнення замежных інвестараў. Сур'ёзныя прапановы па ўдзелу ў будаўніцтве беларускай Сіліконавай даліны паступілі з ПАР, Японіі, Турцыі і ЗША.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў неабходнасць складання праграмы бізнэс-плана. Паводле слоў кіраўніка дзяржавы, да канца 2007 года павінен быць праведзены конкурс па вызначэнню прыватнага замежнага інвестара, які будзе будаваць Парк высокіх тэхналогій. Прапановы павінны быць падмацаваны дасканалым эканамічным аналізам.

Да гэтага ж тэрміну неабходна завяршыць усе арганізацыйныя работы з тым, каб з 2008 года пачаць забудову гэтага аб'екта. Аляксандр Лукашэнка на заканчэнне адзначыў, што інтарэсы замежных рэзідэнтаў, інвестараў і дзяржавы павінны быць захаваны з выгадай для ўсіх бакоў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**



Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

## РЫЦАРЫ СЁННЯ НА ВУЛІЦАХ МАГІЛЁВА

«Гарачы» тэлефон «Звязды» 287-17-41
## КАМУ ВОЎНА І АЎЧЫНЫ З КАЖУШКОЎ?

**Наш чытач з вёскі Кажушкі Слуцкага раёна Генадзь Іосіфавіч Дзічкоўскі сутыкнуўся з праблемай: трымаючы атару з 15 авечак, ён не ведае, куды падзець воўну і аўчыну.**

**— За некалькі апошніх сезонаў воўны назбіралася кілаграмаў сто, але збыць яе немагчыма. Спрабаваў звярнуцца на адно прадпрыемства ў Бабруйску, якое вырабляе лямец, дык адмовілі. Аўчын таксама маю 12—15, аднак і тут тая ж праблема, падаецца, нікому яны не патрэбны, — паскардзіўся заяўнік.**

Ва ўпраўленні тэкстыльнай галіны канцэрна «Беллегпрам» нас не абнадзеілі: воўну ад насельніцтва не прымаюць, паколькі, паводле слоў спецыялістаў, яна, як правіла, грубая ці паўгрубая, іншымі словамі, належным чынам не апрацаваная. А вытворцам патрэбна доўгая тонкая воўна.

У скурна-абутковым упраўленні канцэрна прыкладна тое ж сказалі і пра набыццё аўчын ад насельніцтва: «Хіба толькі гэта футравая аўчына. У нас з ёй працуе Віцебскі футравы камбінат. Калі якая іншая — прабачце».

У гарадскім пасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёна працуюць і валяльна-лямцавая фабрыка, і скурзавод. Магчыма, чытачу трэба звярнуцца туды?

На фабрыцы патлумачылі, што па шэрагу прычын нашаму заяўніку рабіць гэта немэтазгодна. Па-першае, беларуская воўна па тэхналогіі непажаданая для апрацоўкі на абсталяванні, якое ёсць на прадпрыемстве. Не, рабіць гэта можна, але справа ў тым, што айчынная воўна, як правіла, тлуснапотная і будзе забіваць абсталяванне, а выхад чыстай сыравіны са 100 кілаграмаў будзе невялікім. На фабрыцы працуюць пераважна з сярэднеазіяцкай сыравінай, бо руно авечкі з-за асаблівасцяў тамтэйшага клімату ўтрымлівае менш тлушчу. Перапрацоўваюць на прадпрыемстве і айчынную воўну, калі яна паступае аднасна буйнымі партыямі. Раз-пораз такія партыі па 1—2 тоны пастаўляюць нарыхтоўчыя арганізацыі.

Па-другое, каб прыняць ад прыватніка воўну, трэба, каб ён прадставіў ветэрынарнае пасведчанне. Такая даведка, як патлумачылі на прадпрыемстве, выдаецца на платнай аснове. Выдаткі на яе атрыманне, калі ўлічыць невялікі аб'ём воўны ў чытача, будуць, напэўна, параўнальнымі з магчымым прыбыткам ад продажу гэтай партыі. Нарэшце, па-трэцяе: транспартныя выдаткі, калі чытач вырашыць самастойна везці воўну са Слуцкага раёна ў Чэрвеньскі...

На скурзаводзе мы пачулі прыкладна тое ж самае: і пра ветэрынарны сертыфікат, і пра мінімальную партыю ў тры тоны сыравіны хаця б раз у месяц (тады можна будзе закупляць патрэбнае абсталяванне, распрацоўваць тэхналогію, бо тут працуюць са скурамі буйной рагатай жывёлы).

Пасля гэтага мы патэлефанавалі ў Белкаапсаюз. Там, выслухаўшы просьбу нашага чытача, абяцалі па магчымасці дапамагчы (калі сыравіна будзе належнай якасці): занатавалі дакладныя каардынаты вяскоўца для набыцця воўны і аўчын, што маюцца ў яго.

Ад рэдакцыі можам даць яшчэ адну параду. Можна паспрабаваць даць аб'яву аб продажы воўны і аўчын — для людзей, якія займаюцца народнымі промысламі і рамёствамі. Напрыклад, у некаторых раёнах (у тым ліку і ў Слуцкім, наколькі нам вядома) саматужнікі вырабляюць тыя ж валёнкі ў хатніх умовах. Як заўважылі на валяльна-лямцавай фабрыцы, для такога працэсу воўна з прыватнага падворка цалкам падыходзіць.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

## ШКОЛЬНЫХ АЎТОБУСАЎ ХАПАЕ

**У Віцебскай вобласці сёлета для падвозу дзяцей аддзелы адукацыі набылі 3 аўтобусы, яшчэ 7 пасля аб'яўлення тэндару планавалася набыць да пачатку навучальнага года.**

Паводле слоў начальніка ўпраўлення адукацыі Віцебскага аблвыканкама Івана Шчурка, забяспечанасць аўтатранспартам выканана на 99,5 працэнта. Падвоз, у тым ліку і грамадскім транспартам, арганізаваны для 15,2 тыс. дзяцей — вучняў агульнаадукацыйных устаноў. Транспартам аддзелаў адукацыі перавозяць больш за 33 працэнты вучняў. Раней за сродкі абласнога бюджэту купілі 120 школьных аўтобусаў. Ва ўпраўленні канстатавалі, што скаргі ад жыхароў па гэтай тэме — адзінкавыя. Была сур'ёзная праблема з падвозам дзяцей у школу вёскі Мяжа Аршанскага раёна, але ж яна вырашаецца: 1 верасня новы аўтобус павінен выйсці ў першы рэйс.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## У БЕЛАРУСІ РАСПРАЦАВАНЫ ДАПАМОЖНІК ПА АПЕРАТЫЎНАМУ ЭКСПЕРЫМЕНТУ ЯК СПОСАБУ ВЫЯЎЛЕННЯ ХАБАРНІЦТВА

**Аддзелам метадычнага забеспячэння працідзеяння найбольш небяспечным відам злачынстваў Навукова-практычнага цэнтра праблем умацавання законнасці і правапарадку Генеральнай пракуратуры Беларусі падрыхтавана для службовага карыстання навукова-метадычная распрацоўка «Аператыўны эксперымент як спосаб выяўлення хабарніцтва».**

Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў Генпракуратуры, у дапаможніку з пазіцыі законнасці, мэтазгоднасці і прававой абгрунтаванасці разглядаюцца тактычныя, арганізацыйныя і доказныя праблемы выкарыстання аператыўнага эксперыменту. Яго аўтары прааналізавалі заканадаўчую базу, што рэгулюе парадак і ўмовы правядзення і замацавання ў якасці доказаў па справах аб хабарніцтве вынікаў праведзеных аператыўных эксперыментаў, выявілі прабелы і неадпаведнасці ў заканадаўчым рэгуляванні.

У працэсе работы над метадычным дапаможнікам былі вывучаны спыненыя вядзеннем крымінальныя справы аб хабарніцтве, праведзены аналіз выяўленых недахопаў пры правядзенні і працэсуальным замацаванні ў якасці доказаў вынікаў правядзення аператыўных эксперыментаў. З выкарыстаннем айчыннага і замежнага вопыту работнікамі цэнтра распрацаваны навуковыя рэкамендацыі па паляпшэнню заканадаўчай базы, што рэгулюе правядзенне аператыўнага эксперыменту і замацаванне атрыманых вынікаў у якасці доказаў па справах аб хабарніцтве.

## «МІНСКІЯ ТЭЛЕСЕТКІ» ЗНІЖАЮЦЬ З 1 ВЕРАСНЯ ТАРЫФЫ НА БЕЗЛІМІТНЫ ВЫСАКАСКОРАСНЫ ДОСТУП У ІНТЭРНЭТ

**УП «Мінскія тэлевізійныя інфармацыйныя сеткі» зніжае з 1 верасня 2007 года тарыфы на безлімітны высакаскорасны доступ у сетку Інтэрнэт, які ажыццяўляецца пры дапамозе тэлевізійных кабельных сетак. Зніжэнне закранула ў першую чаргу найбольш актуальныя тарыфы, паведамілі БЕЛТА ва УП.**

Так, кошт безлімітнага начнога доступу ў Інтэрнэт ад МТІС зніжаны на 25 працэнтаў, кругласутачнага і выхаднога дня — на 10 працэнтаў. Падключэнне да сеткі не патрабуе наяўнасці тэлефоннай лініі, ажыццяўляецца па тэлевізійнаму кабелю з дапамогай мадэма бясплатна на ўвесь час дзеяння дагавора. Максімальная скорасць падключэння — 1 Мб/с.

**Алена САЛАНЕНКА, БЕЛТА.**

## РОЗГАЛАС
АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### У ГЭТУ СУБОТУ — НА ПАЛЯВАННЕ

**З першай суботы верасня, згодна з Правіламі вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання, у нашай краіне павінен распачацца асенні сезон палявання на птушку.**

У прыватнасці, гаворка ідзе пра гусь белалобую, гусь-гуменніка, рабчыка, шэрую курапатку. Паляванне дазваляецца на птушак любога полу і ўзросту ў светлы час сутак па апошнюю нядзелю лістапада. На гусей — на пралёце ружэйным спосабам з падыходу, з засады (можна выкарыстоўваць падсадных гусей, чучалы, профілі, вабікі), на рабчыка — тым жа спосабам з вабікамі, на шэрую курапатку — ружэйным спосабам з падыходу, з паляўнічымі сабакамі, безружэйным — з лоўчымі птушкамі.

Як удакладнілі ў Міністэрстве лясной гаспадаркі, сёлета перанос тэрмінаў пачатку палявання ў сувязі з умовамі надвор'я, як здаралася ў папярэднія сезоны, не абмяркоўваўся.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### У КІЛЕРЫ НЕ ВЫЙШАЎ

**У Глыбоцкім раёне Віцебскай вобласці прадухілена заказное забойства і разбой. Аб гэтым паведамілі ў пракуратуры Віцебскай вобласці.**

Двайное злачынства арганізаваў мясцовы непрацуючы жыхар 1968 года нараджэння. Першапачаткова ён задумаў забіць індывідуальнага прадпрымальніка, з якім быў знаёмы. Прычынай для ўчынення злачынства сталі працяглыя непрыязныя адносіны паміж мужчынамі. Жыццё свайго крыўдзіцеля зламыснік ацаніў у 1,5 тыс. долараў. «Заказ» павінен быў выканаць раней неаднаразова судзімы жыхар Глыбоцкага раёна. Аб злачынстве, якое рыхтавалася, стала вядома праваахоўным органам, таму далейшыя падзеі развіваліся пры іх непасрэдным удзеле. У прыватнасці, супрацоўнік пад выглядам памочніка выканаўцы кантраляваў увесь ход сітуацыі.

У працэсе падрыхтоўкі да забойства з карыслівымі памкненнямі зламыснік задумаў учыніць яшчэ і разбой. Гэтым разам яго мішэнню стала мясцовая бізнэс-лэдзі, якая, паводле звестак мужчыны, мела 55 тыс. долараў. Затрыманне арганізатара двух злачынстваў адбылося ў момант перадачы яму 6 тыс. долараў, атрыманых у выніку «абрабавання» жанчыны.

Супраць жыхара Глыбоцкага раёна ўзбуджаны дзве крымінальныя справы — за падбухторванне да наўмыснага забойства па найму і па факту разбою. Зараз яму пагражае ад 8 да 25 гадоў пазбаўлення волі, — дадалі ў пракуратуры.

**Вольга ДАВЫДАВА, БЕЛТА.**

### КАНФІСКАВАНЫ 450 КМ СЕТАК І АРСЕНАЛ ЗБРОІ

**За сем месяцаў Дзяржаўнай інспекцыяй аховы жывёльнага і расліннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь было выяўлена 8170 парушэнняў у галіне прыродаахоўнага заканадаўства.**

Напрыклад, было зафіксавана 5058 парушэнняў Правілаў вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства. У парушальнікаў канфіскавана 10 188 сетак агульнай даўжынёй звыш 450 кіламетраў і 9 655 кілаграмаў незаконна вылаўленай рыбы. Адзначана 126 выпадкаў крадзяжу рыбы з сажалак, больш за 526 кілаграмаў скрадзенай рыбы вернута рыбгасам. Інспектары зафіксавалі 324 парушэнні Правілаў вядзення паляўнічай гаспадаркі і палявання. Канфіскавана 213 адзінак агнястрэльнай зброі, у тым ліку 99 адзінак — незарэгістраванай.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### ВАГОН «СПАТЫКНУЎСЯ»

А калі дакладней, дык сышоў з рэек. У час руху таварнага саставу з Гомеля ў Жлобін. Як паведамілі ў абласным упраўленні МНС, прычынай аварыі магло стаць пападанне староннега прадмета пад колавую пару. Пацярпеўшых няма. Затрымак у руху іншых паяздоў не было, бо аварыю ліквідавалі адразу.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### ПАМЯЦЬ АБ'ЯДНОЎВАЕ НАРОДЫ

**Успаміны аб падзеях другой сусветнай вайны жывыя і балючыя не толькі для беларусаў. У суседняй Польшчы адным з самых трагічных момантаў было Варшаўскае паўстанне 1944 года, у падрыхтоўцы якога вялікую ролю адыгралі таксама нашы землякі. Таму невыпадкова, што выстава, прысвечаная Варшаўскаму паўстанню, прадстаўлена ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі.**

Яе наладзіў Польскі інстытут у Мінску для таго, каб расказаць аб адной з драматычных старонак ваеннай гісторыі. Варшаўскае паўстанне стала кульмінацыйным момантам аперацыі пад назвай «Навальніца». Яна расцягнулася на месяцы са студзеня да лістапада 1944 года. Амаль 50 тыс. добраахвотнікаў паўсталі супраць ворагаў. Варшава імкнулася здабыць сваё вызваленне крывёй — каля 180 тыс. яе жыхароў загінулі ў акупаваным горадзе, 18 тыс. паўстанцаў аддалі свае жыцці за яго вызваленне. У кожнай краіне ёсць свае старонкі памяці. Але памяць аб апошняй вайне аб'ядноўвае народы.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**




**КУП «Минский областной центр учета недвижимости»**
**проводит открытый аукцион по продаже, обращенных в доход государства:**

| Объект | Общая площадь (кв.м) | Адрес | Начальная цена (бел. руб.) | Размер задатка (% от нач. цены, бел. руб.) |
|---|---|---|---|---|
| здание арматурного цеха | 2031,8 | г. Молодечно, ул. Рабочая, 8 | 547 279 200 | 10 % |
| трехэтажное здание вспомогательных помещений | 1739 | Молодечненский район, д. Красное | 842 676 000 | 10 % |
| незавершенное строительством капитальное строение, (пристройка к корпусу № 17 «а») | 1598,4 | г. Молодечно, ул. В. Гостинец, 67 | 643 647 060 | 10 % |
| здания конторы | 443 | Молодечненский район, д. Носилово, ул. Новая, 2 | 110 810 430 | 10 % |
| здание цеха № 2 по выпуску кирпича, шихтозапасник туннельная печь «Модуль 70» туннельная сушилка | 21182,3 | Молодечненский район, г.п. Радошковичи, ОАО «Радошковичский керамический завод» | 3 345 114 267 | 50 000 000 |
| административно-бытовое здание, вагон – рефрижератор, гараж (об. пл. 432 кв.м), здание кормокухни (об. пл. 432 кв.м), котёл-парообразователь, зерносклад | | Молодечненский район, п. Чисть, ул. Парковая, 7 | 567 320 000 | 5 % |
| административно – бытовая пристройка | 3898,3 | г. Молодечно, ул. Замковая, 19 | 764 424 900 | 5 % |

Задаток перечисляется на р/с 3012020200010 Октябрьское отделение ОАО «БПС—Банк» МФО 153001357, УНП 690324015 КУП «Минский областной центр учета недвижимости». Объекты продаются без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению местного исполкома. Оплата за объект должна быть произведена в течение 2 (двух) месяцев и 25 (двадцати пяти) дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится **18.09.2007 г**. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, ком. 321. Заявление на участие и необходимые документы принимаются по **17.09.2007 г.** до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8-017) 224-61-34. Наш сайт в Интернете: www.rlt.by.**

## ЛІКВІДАВАНА БЕЛАРУСКАЯ ЭКАЛАГІЧНАЯ ПАРТЫЯ ЗЯЛЁНЫХ «БЭЗ»

**29 жніўня Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусь задаволіў іск Міністэрства юстыцыі аб ліквідацыі Беларускай экалагічнай партыі зялёных «БЭЗ».**

Прычынай ліквідацыі партыі стала невыкананне патрабаванняў заканадаўства рэспублікі. У прыватнасці, партыя не мела патрэбнай колькасці арганізацыйных структур у Мінску і рэгіёнах краіны, а таксама патрэбнай колькасці членаў. Паводле інфармацыі міністэрства, у ёй было 582 чалавекі, у той час як заканадаўства вызначае мінімальную колькасць у памеры 1 тыс. чалавек. У пачатку 2007 года Міністэрства юстыцыі папярэдзіла партыю аб неабходнасці выпраўлення згаданых парушэнняў альбо прыняцця рашэння аб самаліквідацыі. Аднак парушэнні выпраўлены не былі, таксама як і не былі прадстаўлены патрэбныя дакументы аб самаліквідацыі. Тым часам Міністэрства юстыцыі ўдакладніла інфармацыю пра папярэджанні, вынесеныя шасці палітычным партыям («Звязда» ад 28 жніўня). Раней міністэрства памылкова паведаміла пра папярэджанне Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (Грамада). У сапраўднасці пісьмовае папярэджанне было вынесена партыі «Беларуская сацыял-дэмакратычная Грамада», якой кіруе былы старшыня Вярхоўнага Савета Станіслаў Шушкевіч.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

**БПС-БАНК**

В связи с изменением Национальным банком Республики Беларусь ставки рефинансирования в ОАО «БПС-Банк» вводятся новые процентные ставки:

с 01.08.2007 по вновь заключаемым договорам по банковскому депозиту до востребования в белорусских рублях «Пенсионный» и карт-счету в белорусских рублях «Пенсионный» устанавливается процентная ставка в размере 7,69 % годовых, по срочному банковскому депозиту на 1,5 года в белорусских рублях «Премиальный» устанавливается процентная ставка в размере 12,25 % годовых, по депозиту «К совершеннолетию» на 2 года – 13,25 % годовых, на 3 года – 14,25 % годовых.

По действующим договорам установленные ставки применяются с 01.10.2007.

**Дополнительную информацию можно получить в любом учреждении открытого акционерного общества «Белпромстройбанк» или по телефону в Минске 289-46-06**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь № 4 от 11.07.2007 года на осуществление банковской деятельности.*

*Возврат средств физических лиц в ОАО «БПС-Банк» гарантируется в соответствии с законодательством Республики Беларусь.*

## Кошт расійскага газу на 2008 год будзе вядомы ў канцы года

**Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік генеральнага дырэктара «Белтрансгаза» Вінерый Валчуга.**

Ён патлумачыў, што кошт газу будзе вызначацца згодна з формулай, якая запісана ў кантракце аб пастаўках газу да 2011 года, які быў падпісаны з «Газпрамам» у апошні дзень 2006 года. Пры гэтым кошт нельга ведаць ужо сёння, бо ён залежыць ад таго, як будзе складвацца кан'юнктура цэн «на складовыя формулы». Намеснік генеральнага дырэктара дадаў таксама, што сёння «Белтрансгаз» пачаў «працу над падрыхтоўкай рэгламенту працы з формулай», які дазволіць «правільна карыстацца ёю». «Разуменне і наша, і «Газпрама» павінны супасці. Бо кожны ў свой бок глядзіць, чытаць можна па-рознаму». Працу плануецца завяршыць да 1 кастрычніка. «З 1 кастрычніка мы прыблізна зможам ведаць, як карыстацца формулай».

Вінерый Валчуга паведаміў таксама, што кантракт на пастаўку газу ў Беларусь і яго транзіт праз тэрыторыю краіны на 2007 год «выконваецца паспяхова ўсімі бакамі». «Газпрам» выконвае свае абавязкі. Мы — свае па разліках. На гэты момант не павінна быць ніякіх сумненняў, што мы яго выканаем у параметрах, якія ў яго закладзены».

Начальнік галоўнага ўпраўлення перспектыўнага развіцця і інвестыцый Міністэрства энергетыкі Уладзімір Баброў паведаміў журналістам, што АЭС у краіне можа быць пабудавана «не раней за 2015 год. Калі шчыра — у 2017 годзе». Пры гэтым ён дадаў, што ўлады будуць імкнуцца ажыццявіць будаўніцтва станцыі «сіламі будаўніча-мантажнага комплексу Беларусі». У той жа час у краіне існуюць «праблемы з праекціроўшчыкамі і будаўнікамі» ў атамнай энергетыцы. «З гэтага пункту гледжання, магчыма, сваімі сіламі будаўніцтва і не асілім». У такім выпадку, як адзначыў Уладзімір Баброў, будуць прыцягвацца падрадчыкі з іншых краін.

**Сяргей КУЗНЯЦОЎ.**

ОАО «Борисовское предприятие музыкальных инструментов» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

проводят открытый аукцион по продаже: здания Дома культуры об.пл. 1753,0 кв.м, расположенного: г. Борисов, ул. 1-го Июля, д. 8. Площадь зем. участка 0,6681 га. Начальная цена – 357 700 000 бел. рублей. Задаток в размере 10% от начальной цены перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. Объект продается без условий. Переход права пользования земельным участком будет осуществлен по решению райисполкома. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. Аукцион состоится 02.10.2007 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 01.10.2007 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 224-61-34**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by.**

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 31.08.2007 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 2 926,79 |
| 1 латвійскі лат | 4 192,95 |
| 1 літоўскі літ | 847,63 |
| 1 чэшская крона | 105,78 |
| 1 польскі злоты | 765,01 |
| 1 расійскі рубель | 83,71 |
| 1 украінская грыўня | 427,43 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 25,6494 |
| 10 UAH | 50,9989 |
| 1000 BYR | 11,9244 |
| EUR | 35,0114 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 30.08.2007 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2140 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2007 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

ISSN 1990 - 763X
07163>

## Эканомія і беражлівасць

# Акупнасць больш чым праз 1000 гадоў?

**Супрацоўнікі Камітэта дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці праверылі, як эфектыўна ў рэгіёне выкарыстоўваюцца дзяржаўныя грошы на ажыццяўленне мерапрыемстваў па энергазберажэнню. Высветлілі, што Абласным цэнтрам па энергазберажэнню Віцебскага аблвыканкама пры распрацоўцы рэгіянальнай праграмы дапушчаны шматлікія парушэнні.**

У прыватнасці, каб атрымаць бюджэтныя сродкі для выканання малаэфектыўных мерапрыемстваў, адзначаныя ў праграме тэрміны іх акупнасці (ад 8 дзён да 20 гадоў) былі заніжаныя, а па праведзенаму Камітэтам пераразліку яны на самай справе складаюць ад 35 дзён да 155 гадоў. Пры гэтым для забеспячэння эфектыўнасці выкарыстання сродкаў, што накіроўваюцца на рэалізацыю энергазберагальных мерапрыемстваў, тэрмін акупнасці не павінен перавышаць 5 гадоў.

Напрыклад, па мерапрыемству «Укараненне эканамічных сушылак зерня» ў вышэйназваны цэнтр камітэтам па сельскай гаспадарцы і харчаванню Віцебскага аблвыканкама прадстаўлена інфармацыя з адлюстраваннем тэрміну акупнасці 6,3 года замест 155 гадоў. Кантралёры зрабілі вывад: цэнтрам не правяралася дакладнасць прадстаўленай інфармацыі.

Яшчэ факт: у адміністрацыйным будынку абласнога ўпраўлення ЖКГ устанавілі сучасныя шклопакеты. Было абгрунтавана, што іх акупнасць — 5,4 года. Але ж па справаздачных даных просты тэрмін акупнасці — 18 гадоў.

Не выканалі заданне па павялічэнню выкарыстання мясцовых відаў паліва 8 раёнаў Віцебшчыны. Выяўлены высокі ўзровень страт на прадпрыемствах жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Не вельмі актыўна шматкватэрныя дамы аснашчаюцца лічыльнікамі цяпла і г.д.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Тэрмін працягласцю ў жыццё

**Двое мінскіх старшакласнікаў прыгавораны да 15 і 17 гадоў пазбаўлення волі за забойства з асаблівай жорсткасцю прадпрымальніка. Аб гэтым паведамілі ў Мінскім гарадскім судзе.**

У 2005 годзе двое падлеткаў, якім на момант учынення злачынства споўнілася па 16 гадоў, набылі і захоўвалі пісталет «Заўэр» мадэлі 1913 года. Пад маркай перадачы грошай за быццам бы набываемы аўтамабіль «БМВ-735» яны выманілі аўтаўладальніка за горад. На аўтатрасе паміж Мінскам і пасёлкам Калодзішчы адзін з падлеткаў выстраліў у галаву бізнэсмену, пасля чаго нанёс яму ў шыю дзевяць удараў нажом. Падзельнікі скралі аўтамабіль і маёмасць, якая ў ім знаходзілася, на агульны кошт амаль 35 млн беларускіх рублёў.

У судзе адзначылі, што праваахоўныя органы мелі магчымасць затрымаць злачынцаў па гарачых слядах. На пад'ездзе да Мінска аўтамабіль спынілі супрацоўнікі дарожна-паставой службы ДАІ. Падлеткі пакінулі аўтамабіль і паспрабавалі ўцячы ў лес, дзе іх дагналі інспектары. Аднак, даведаўшыся аб іх непаўналетнім узросце і тым, што аўтамабіль ім не належыць, адзін з інспектараў пайшоў на здзелку з маладымі людзьмі, адпусціўшы іх за хабар у 200 тыс. беларускіх рублёў. Апраўдваючыся ў судзе, інспектары заявілі, што не падазравалі аб учыненым злачынстве, паколькі не аглядалі аўтамабіль і, адпаведна, не бачылі плям крыві ў салоне.

Пасля высветлілася, што падобнае патуранне не толькі прывяло да павелічэння тэрміну раскрыцця злачынства, але і садзейнічала ўчыненню новага — угону аўтамабіля «Міцубісі Паджэра», які належаў забітаму і яго сястры. Рэгістрацыйныя дакументы на гэты аўтамабіль маладыя людзі знайшлі ў «БМВ-735». Прычым крадзеж японскага аўтамабіля з адной з аўтастаянак Мінска падлетак, які забіў бізнэсмена, учыніў з удзелам яшчэ двух падзельнікаў. Сума скрадзенага на гэты раз склала больш за 36 млн беларускіх рублёў. Толькі пасля ўгону другога аўтамабіля ўсе члены злачыннай банды былі затрыманы і змешчаны пад варту.

Усяго па гэтай крымінальнай справе праходзілі 9 чалавек, з якіх 3 — інспектары ДПС. Адзін з іх прыгавораны да 7 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах узмоцненага рэжыму з канфіскацыяй маёмасці. Двое іншых асуджаны за бяздзейнасць да 2 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму.

Галоўныя вінаватыя злачынстваў прыгавораны да 15 і 17 гадоў пазбаўлення волі ва ўмовах агульнага рэжыму, а іх падзельнікі, вінаватыя ва ўкрывальніцтве і крадзяжы другога аўтамабіля, правядуць у месцах пазбаўлення волі ад 2 да 5 гадоў. Заключэння пазбегла толькі адна сведка, якую асудзілі за неданясенне аб дакладна вядомым асабліва цяжкім злачынстве. Дзяўчыне назначылі пакаранне ў выглядзе штрафу ў 40 базавых велічынь.

Разгледзеўшы касацыйную скаргу асуджаных, Вярхоўны суд Рэспублікі Беларусі пакінуў прыгавор Мінскага гарадскога суда без змянення.

**Уладзімір МАЦВЕЕЎ, БЕЛТА.**

### А на мой погляд...

# «Рукі маці пахнуць гэтак жа, як і дзесяцігоддзі таму...»

**Учора мы паведамлялі, што хутка з вуліц нашай сталіцы знікнуць маральна састарэлыя аўтобусы «Ікарус», якія будуць заменены на сучасныя «МАЗы». На наш погляд, «Ікарусы» былі для большасці з нас не толькі і не столькі пасажырскім транспартам, але і ў нейкай ступені сімвалам ранейшага жыцця. Хаця гэта стала зразумелым толькі цяпер, калі гэты сімвал знікае з нашага жыцця.**

**А ПРА ЯКІ СІМВАЛ — МАТЭРЫЯЛЬНЫ, ДУХОЎНЫ — ЯКІ ЗНІК З ВАШАГА ЖЫЦЦЯ, ВЫ, МАГЧЫМА, ШКАДУЕЦЕ ЗАРАЗ?**

**Аксана ПАРАНЧУК, хатняя гаспадыня з в. Новыя Дактаравічы Капыльскага раёна:**

— Вось так адразу магу прыгадаць, напэўна, Алімпійскія гульні ў Маскве і іх сімвал — алімпійскага Мішку. Справа ў тым, што мы таксама ў пэўным сэнсе прымалі ў іх удзел *(смяецца)*. Я тады вучылася ў горадзе Ельні Смаленскай вобласці і нам даводзілася добраўпарадкаваць тэрыторыю, прымаць спартсменаў, якіх размяшчалі ў нашым горадзе. Памятаю, мы пісалі і клалі ім пад падушкі запіскі з пажаданнямі: каму і што выйграць. Гэта было вельмі запамінальна.

**Сяргей СОБАЛЕЎ, намеснік начальніка Ашмянскай мытні:**

— *(Смяецца)*. Першае верасня, напітак крэм-сода, памятаеце, быў такі. А калі сур'ёзна... Не ведаю, як вы гэта пакладзеце на паперу... Я вырас у вёсцы, таму прыгадваецца цёплы пыл на дарозе, па якім мы бегалі басанож, сенакос... Гэта заўсёды атаясамлівалася з парой школьных канікулаў. Прылёт ластавак у маі... Асацыяцыі з дзяцінствам: пах рук маці... Вы ведаеце, з той пары прайшло ўжо не адно дзесяцігоддзе, а рукі маці маюць усё той жа пах, ён не змяніўся... У больш познім узросце, калі мне было 15—16 гадоў і даводзілася дапамагаць на камбайне падчас жніва — пах свежаскошанага жыта... З узростам я заўважыў, што таміх яскравых успамінаў ужо чамусьці няма: адзін год падобны на другі. Прыгадаць, канешне, ёсць што, але гэтыя ўспаміны нельга параўнаць з тымі, што былі ў дзяцінстве.

**Галіна САДОЎСКАЯ, начальнік аддзела крэдытавання рознічнага бізнэсу філіяла № 422 ААБ «Беларусбанк», г. Слонім:**

— Гэта дэманстрацыі. Іх нічым не заменіш. Вельмі шкадую і я, і мае сябры, калегі, што іх больш няма. Памятаеце, раней, акрамя Новага года, былі галоўныя святы: 1 Мая, 9 Мая, 7 лістапада, калі абавязкова праводзіліся святочныя дэманстрацыі. Прыемна было прайсціся разам з усімі па святочных вуліцах, выйсці на плошчу... Мы некалі жылі ва Узбекістане, вельмі добра памятаю дэманстрацыі на 9 Мая. Увогуле, да дэманстрацый рыхтаваліся, іх чакалі. Была магчымасць сабрацца разам у святочнай абстаноўцы, пагутарыць, адпачыць, бо заўсёды абавязкова пасля ладзіліся канцэрты мастацкай самадзейнасці.

**Аляксандр САРОКА, вядучы спецыяліст Стаўбцоўскай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

— Пра тое, што калісьці трава на футбольным полі была стаптана больш, чым зараз, на ім было больш пылу... Калісьці мы вельмі часта збіраліся, каб пагуляць у футбол. Нават студэнтамі прыязджалі з розных гарадоў дадому, каб зноў сустрэцца і паганяць мяч. Гэта былі сяброўскія зносіны, хлапечая салідарнасць і адначасова занятак спортам. Зараз я асабліва не назіраю, каб сучасная моладзь імкнулася найперш на стадыён. Кажу ж вам, трава на ім цяпер расце мацней. Маладых людзей хутчэй можна заўважыць на прыпыначных пунктах з півам і цыгарэтамі, чым на стадыёне.

**Віктар СВЁКЛА, старшыня Шчорсаўскага сельскага Савета дэпутатаў Навагрудскага раёна:**

— Шкадую аб адным: гады прайшлі, жыццё хутка прамільгнула і не заўсёды ад яго ўдавалася атрымліваць задавальненне *(смяецца)*. А калі сур'ёзна, шкадую аб ранейшым паўнацэнным жыцці вёскі, калі жылі адной вялікай сям'ёй, выраршалі самі многія праблемы, на працу і з працы ішлі з песнямі... Добра тады вёска жыла, і жыццё ў ёй кіпела. А зараз возьмем да прыкладу наш сельскі Савет. На яго тэрыторыі 9 вёсак, каля 1,5 тыс. чалавек, пражываюць яны ў 830 дамах. А яшчэ ў дадатак да іх — 450 пустуючых дамоў! Раней такога ніколі не было. А сёння колькасць пенсіянераў у вёсцы павялічваецца, дэмаграфічная сітуацыя пакідае жадаць лепшага. Кіраўнік дзяржавы вымушаны прымаць шэраг указаў — і па аграгарадках, і па тых жа пустуючых дамах — каб выправіць сітуацыю. Шмат ужо зроблена ў гэтым накірунку, але тое, што разбуралася гадамі, на жаль, вельмі цяжка аднавіць у кароткі тэрмін.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**



Практычна з самай раніцы на школьным базары ў Брэсце можна сустрэць матуль з дзецьмі. За апошнімі навінкамі школьнай моды і неабходнымі прыладамі жыхары горада едуць на школьны базар.

На здымку: Даша КАМЯНЕЦ з мамай Наталляй прымяраюць школьную форму на школьным базары ў Брэсце.

Фота Уладзіміра ЧЭБЕРКУСА, БЕЛТА.

# СЕМНАЦЦАЦЬ ПОГЛЯДАЎ НА СВЕТ, СЕМНАЦЦАЦЬ ФІЛАСОФІЙ




**У Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі адкрылася выстава «Ад роднае зямлі, ад гоману бароў...» Беларускае грамадскае аб'яднанне «Фотамастацтва» і народны фотаклуб «Мінск» наладзілі калектыўную экспазіцыю фотаработ семнаццаці майстроў светапісу і прысвяцілі яе песняру зямлі беларускай Якубу Коласу.**

— Усе здымкі, прадстаўленыя тут, — расказвае старшыня НФК «Мінск», адзін з арганізатараў выставы Яўген Казюля, — зроблены па коласаўскіх мясцінах, у асноўным на Стаўбцоўшчыне, дзе нарадзіўся, жыў і тварыў вялікі паэт і пісьменнік.

Мясціны беларускай зямлі, што з такой любоўю і замілаваннем апяваў Колас, вабяць да сябе мастакоў слова, пэндзля, светапісу. І нараджаюцца творы...

Здымкі, зробленыя аўтарамі ў адных і тых жа месцах, — Мікалаеўшчыне, Альбуці, Смольні, Свержані, Ластку, — паўсталі перад гледачамі настолькі рознымі па настрою, па светлавому, каляроваму каларыту, па манеры падачы твора, што дзіву даешся, наколькі непаўторны, ярка індывідуальны, самабытны, творчы погляд кожнага ўдзельніка.

Семнаццаць удзельнікаў — семнаццаць філасофій і поглядаў на жыццё і рэчаіснасць вакол нас. Атрымаўся самабытны калектыўны твор, аб'яднаны любоўю да прыгажосці, стрыманай і мілай беларускай прыроды, нацыянальных каштоўнасцяў, фотамастацтва.

Выстава працягне сваю работу па 9 верасня.

**Марыя ЖЫЛІНСКАЯ. Фота аўтара.**



***Калектыў рэдакцыі газеты «Звязда» глыбока смуткуе з выпадку смерці Георгія Лаўрэнцьевіча НАПРЭЕВА — аднаго са старэйшых журналістаў краіны, аўтара ўнікальных кніг па гісторыі і практыцы публіцыстыкі, мудрага і добразычлівага настаўніка многіх беларускіх журналістаў і проста харошага чалавека — і выказвае самыя шчырыя спачуванні яго сям'і, родным і блізкім.***

## «НЯПРАВІЛЬНЫ» «ГЕНЕРАЛ»

**У Віцебску ў прыватным доме на вуліцы Цітова міліцыянеры і супрацоўнікі Упраўлення дэпартаменту фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю знайшлі цэлы міні-завод па вырабу фальсіфікаванай гарэлкі «Генерал», маркіраванай падробленымі акцызнымі маркамі. Яго ўладальнік — беспрацоўны.**

Як растлумачылі сітуацыю ў прэс-цэнтры УУС Віцебскага аблвыканкама, падчас агляду дома знайшлі 114 бутэлек гарэлкі «Генерал» ёмістасцю па 0,7 літра ўжо з акцызамі, а таксама гарэлку без акцызаў, падробленыя акцызныя маркі, 105 літраў спіртавой вадкасці і ўсё неабходнае для вырабу «няправільнай» гарэлкі.

## ЯК УГАНЯЛІ «МАРШРУТКУ»

**Супрацоўнікі аддзела ДАІ Полацкага ГАУС у 3 гадзіны ночы на вуліцы Крынічнай убачылі пашкоджаную аўтамашыну «ГАЗ» — маршрутнае таксі.**

Высветлілася, што фактычна новае аўто, выраблене летась, угнаў сын вадзіцеля «маршруткі» (бацька працуе на індывідуальнага прадпрымальніка).

Хлопец, які нідзе не працуе, перад угонам скраў ключы. Падчас руху не справіўся з кіраваннем, аўтамабіль перакуліўся.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

# Малочныя рэкі, кісельныя берагі...

**Гэтымі днямі ў Доме прэсы праходзіла выстава-кірмаш харчовай вытворчасці Мінска.**

Паводле слоў Уладзіміра Семенчука, першага намесніка генеральнага дырэктара КУП «Мінскгархарчапрам», такія мерапрыемствы карысныя для ўсіх — і вытворцаў, і спажыўцоў, бо ў магазіне чалавек звычайна губляецца сярод мноства прадуктаў, робіць пакупкі аўтаматычна...

— Карыстаюцца попытам зерневы тварог, наш хлеб, — паведаміў Уладзімір Уладзіміравіч. — Ужо даказана, што дзякуючы арганізацыі такіх кропак дэгустацыі рост продажу ўзрастае на 30—50 працэнтаў.

Некаторыя людзі наогул выключылі хлеб са свайго рацыёну. З гэтым можа паспрачацца вядучы інжынер-тэхнолаг «Мінскхлебпрама» Ірына Шульга. «У хлеб мы дабаўляем вітаміны, мінералы, узбагачаем яго ёдам, — кажа Ірына Уладзіміраўна. — Ужываць такі хлеб вельмі карысна». Асабліва попытам карыстаюцца «Траецкі дэсертны», «Шчодры», «Жытнёвы зерневы», «Нарачанскі», «Жытніца», «Водар». Сярод навінак — хлеб «Прастор» з парашком марской капусты і «Чэрвеньскі».

Але які хлеб без мяса? Прысутныя на выставе-кірмашы асабліва ацанілі сервелат «Арэхавы», «Арэх мясны», балык «Гурман», у які ўваходзіць па 50 працэнтаў свініны і ялавічыны. «Людзі, якія прыходзілі сюды, былі задаволены якасцю вытворчасці мінскага мясакамбіната, — заявіла вядучы агент па продажы па Мінску Аксана Уразава. Аднак сухама есці не надта карысна, таму галоўны спецыяліст па вытворчасці чайных напояў «Мінскай фабрыкі гародніны» Алена Рахман частавала ўсіх жадаючых цудоўным натуральным чаем. Травы і плады для іх у Беларусі вырошчваюцца ўжо 25 гадоў у Мінскім раёне на плошчы 20 гектараў. «Нашы чаі добра піць з мёдам, — тлумачыць суразмоўца. — Мы распрацавалі розныя рэцэптуры: чай танізуючы, агульнаўзмацняльны, для павышэння імунітэту, вітамінны і г. д.» Сярод навінак — «Вітамінка» для дзяцей і «Малінавы сон».

На дэсерт наведвальнікам прапанавалі прадукцыю малочнага завода № 1 «Малочная краіна», канёк якой — глазураваныя сыркі. Ці ведаеце вы, што іх ужо існуе каля 100 відаў? Вядучы спецыяліст па маркетынгу Андрэй Царыковіч заўважыў, што зараз сыркі ўпакоўваюцца не ў фальгу, як у часы СССР, а ў герметычную ўпакоўку, што зручней для пакупнікоў. Побач з «Малочнай краінай» размясціўся і «Малочны гасцінец», вытворчасць гармалзавода № 2. Яго маркетолаг Таццяна Галкіна пераканала, што самым вялікім попытам сярод беларусаў карыстаюцца прадукты з біфідабактэрыямі, з лактулозай, ёдам, 100-працэнтныя натуральныя сокі ў новай упакоўцы, сыр «Сталічны», фасаваны ў інертным газе.

Калі вам не ўдалося трапіць на харчовую выставу, шукайце прадукты ў крамах і праводзьце сваю дэгустацыю дома. Спецыялісты параілі больш уважліва сачыць за тэрмінам іх годнасці і не ігнараваць карысныя парады.

**Ірына АНАТАВА.**

# ПУСТЫНЯ

## На месцы спаленых у вайну дзвюх вёсак утварыліся пясчаныя дзюны

**Праз некалькі дзён споўніцца 65 гадоў, як з інтэрвалам у тры дні фашысты спалілі чатыры вёскі ў целяханскай зоне Івацэвіцкага раёна разам з усімі жыхарамі. Больш за тысячу ні ў чым не вінаватых людзей акупанты расстралялі або спалілі жывымі. Вяда, Тупічычы і Красніца больш не паўсталі з попелу. Баброўвічы адбудаваліся наноў. Тады ж спалілі і Выганашчы, апошні населены пункт гэтага ляснога і балотнага краю, але вяскоўцы паспелі ўцячы і схавацца ў лясах. Зараз у жывых засталося зусім мала сведак тых чорных дзён.**



Вяда і Тупічычы — старэйшыя населеныя пункты Івацэвіцкага раёна. Узніклі яны больш за пяць стагоддзяў таму за Бабровіцкім возерам на месцы стаянкі старажытнага чалавека. Тысяч шэсць гадоў таму нашы прашчуры аблюбавалі гэта месца ў прыбярэжнай зоне. Да гэтай пары там знаходзяць рэшткі жыццядзейнасці пасяленцаў каменнага веку. А ў сярэдзіне мінулага тысячагоддзя там пасяліліся палешукі — працавіты, моцны душой і целам народ, які і чорта балотнага не баяўся. Жылі, дзяцей гадавалі, хлеб надзённы здабывалі, вяселлі спраўлялі. Асабліва не зважалі на тое, што да «вялікай зямлі» трэба было плыць тры кіламетры па возеры ці рухацца ў абыход па бездаражы 15 кіламетраў да бліжэйшай вёскі. Вось гэтым шляхам у абыход і пад'ехалі карнікі 10 верасня 1942 года. З жыхароў тых вёсак засталося ў жывых некалькі чалавек, якім пашчасціла некуды адлучыцца з дому. На жаль, апошняя сведка знішчэння Вяды і Тупічыч памерла ў гэтым годзе.

Хутчэй за ўсё, у ваколіцах Выганашчаў дзейнічаў адзін і той жа карны атрад. Забівалі, спальвалі жывымі старых і малых з аднолькавым цынізмам ва ўсіх вёсках. Некалькі падлеткаў з Бабровічаў выратаваліся: хто з ранку далекавата пасвіў кароў, а хто цудам, як Сцяпан Кавалевіч або Вольга Петруковіч. Сцяпану Захаравічу Кавалевічу было 12 гадоў. Немец зайшоў у хату і аўтаматнай чаргой ва ўпор скасіў усю сям'ю. Маці, паміраючы, відаць, інстынктыўна накрыла сабой яго, малодшага. Потым параненым ў нагу хлопчык праз акно пераваліўся ў разору, па якой дапоўз да канца агарода. Там яго заўважыў немец, што стаяў у ачапленні. Наставіў зброю, але не выстрэліў. Ці то падзейнічалі ўмольныя дзіцячыя вочы, ці падумаў, што паранены ўсё роўна не выжыве. Але Сцяпан выжыў.

Амаль равеснік Кавалевіча Якаў Лук'янавіч Крот пасвіў кароў. Здалёк бачыў і чуў, што рабілася ў вёсцы. А калі вярнуўся, застаў рэшткі пажару, едкі дым і чорныя печы замест хат і... нікога жывога. Страшны адчай апанаваў дзіцячую душу: што рабіць, куды ісці?.. Цудам ацалелае жыццё падавалася яму горшым за лёс сямейнікаў і суседзяў. Потым пакрысе жывыя збіраліся разам, абсталёўвалі зямлянкі. Дзеці падаваліся да сваякоў у іншыя вёскі. Выжывалі, хто як мог. У Бабровічах 13 верасня загінула 676 чалавек. Згарэла і царква Параскевы Пятніцы.

І вось цяпер знайшоўся энтузіяст, які ўзяўся будаваць капліцу ў гонар гэтай святой. Веніямін Бычкоўскі — нястомны збіральнік гісторыі целяханскага краю. Сам ён расіянін, вандраваў па свеце, а трапіў сюды і назаўжды ўлюбіўся ў Палессе. Жыве Веніямін Мікалаевіч у Целяханах і свой першы музей палескага побыту стварыў ва ўласнай хаце. Зараз вандроўнік і краязнаўца набыў хату ў Бабровічах. Асабліва ўважліва вывучае гісторыю спаленых вёсак. У яго захоўваюцца ўспаміны і тых, хто яшчэ жыве, і тых, каго ўжо няма з намі. Асаблівае месца займае ўспамін Вольгі Рыгораўны Петруковіч, жыхаркі Бабровічаў, якая двойчы глядзела смерці ў вочы: «Пастралялі ўсіх, нават паліцаяў. Я ляжала, накрытая целамі забітых бацькі, сясцёр, братоў. Па руках цякла іх кроў... Калі, хістаючыся, выбралася на вуліцу, упала другі раз — па мне стралялі, куля трапіла ў шыю і выйшла праз патыліцу».

Бабровічы пакрысе адбудаваліся, адрадзіліся. А ў Тупічычы і Вяду больш ніхто не вярнуўся. Карны атрад прыехаў туды на падводах сялян навакольных вёсак, якіх прымусілі паказваць дарогу. Потым, калі расправа была скончана, ад'ехалі кіламетраў восем у адваротным напрамку і пастралялі вознікаў. Каб ніякіх сведак.

А зараз на тым месцы, дзе некалі стаялі вёскі, былі агароды і палеткі, утварылася сапраўдная пустыня. Пясчаныя дзюны дзе-нідзе прарастаюць спецыфічнай пустыннай расліннасцю. У некаторых месцах пяскі з вясны пакрыліся рэдкім мохам. За лета ён выгараў на сонцы і выпетраў так, што стаў чорным, нібы толькі ўчора тут палаў знішчальны агонь. Гэты пустынны пласт займае гектараў 30 паміж лесам, балотам і возерам. Пагоркі мяняюцца нізінкамі, і кругом — адзін жоўты пясок, на якім адбіты разнастайныя звярыныя сляды. Вецер хутка зраўноўвае любы след, значыць, гэтыя свежыя. Звер тут пачувае сябе вольна: лісіца прабягала ўслед за зайцам. Кругом адбіткі лап сапраўднай навалы гэтых мясцін — янотавідных сабак, якіх развялося вельмі шмат. А вясной тут збіраюцца на свае калектыўныя спевы цецерукі.

Пра людзей жа напамінам служыць толькі старэнькі помнік, пастаўлены гадоў трыццаць таму, і вялікі цёмны драўляны крыж, які ўзвышаецца над пагоркам. Каля помніка чамусьці разраслася нізенькая шыпшына. Такіх вялікіх пладоў гэтага кустарніка памерам з добрую сліву я больш нідзе не бачыла. У падножжы сціплага манумента нечай клапатлівай рукой пастаўлены кветачкі. Помнікі — аднолькавыя, тыповыя — стаяць і ў Бабровічах і ў іншых вёсках. А вось адзінокі чорны крыж асабліва кранае душу. За ім крыху далей пачынаецца выпаленая зямля, якая пакрылася сухім, амаль мёртвым пяском.

Вучоныя тлумачаць факт узнікнення пустыні ў Івацэвіцкім раёне ўпаўне матэрыялістычнымі прыроднымі працэсамі. Гэты асаблівы мінеральны кавалак сушы мог быць полем ці агародам раней толькі з дапамогай чалавека. Калі ў вёсках жылі людзі, трымалі жывёлу, глеба пастаянна ўгнойвалася. Стаялі будынкі, раслі дрэвы, што з'яўлялася перашкодай вятрам. А калі вёсак не стала, вецер на адкрытай прасторы пачаў выдзімаць верхні невялікі ўрадлівы пласт глебы. Дарэчы, гадоў праз колькі пасля вайны мясцовы калгас засяваў гэтыя плошчы збожжавымі. Але ўраджаі былі такімі нізкімі, што паступова ад земляробства тут адмовіліся. І вецер да канца зрабіў сваю справу — пабудаваў пясчаныя дзюны. Тут нават паявіліся некаторыя характэрныя для пустыні віды жывёл і птушак. Усё гэта зразумела, для навукоўцаў тут не існуе белых плям. А людзі, якія дзесяцігоддзямі аплаквалі смерць родзічаў, лічаць, што прырода падзяліла смутак душаў памерлых і ўвекавечыла гэты смутак жоўтай пясчанай пустыняй.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

*Івацэвіцкі раён.*

# СМАК МЕДАЛЯ І БАЦЬКОЎСТВА



**«Тата можа, тата можа ўсё, што захочаш, плаваць брасам, крычаць басам, дровы секчы, тата можа ўсё, што захочаш, толькі маці не можа быць...» — памятаеце словы з дзіцячай песенькі? Яны цудоўна адлюстроўваюць адносіны ў спартыўнай сямейнай пары Наталля Харанека — Андрэй Міхневіч, у якіх не так даўно нарадзіўся сын. Абодва штурхальнііі ядра і чэмпіёны. Бацька дзеля Іллі і каханай Наташы гатовы на многія дасягненні, у тым ліку ў спорце, а маладая маці, пакуль сын маленькі, яшчэ не можа вярнуцца ў сектар, хоць вельмі жадае аднавіць сваю кар'еру і паехаць на Алімпіяду ў Пекін. Андрэй Міхневіч стаў на чэмпіянаце свету ў Японіі першым аўтарам медаля для беларускай зборнай — бронзавага. Зараз у яго ўжо ўвесь камплект узнагарод з сусветных першынстваў. Пасля вяртання атлета з Осакі карэспандэнт «Звязды» пацікавіўся, што перашкодзіла яму ўзняцца на больш высокую прыступку п'едэстала і наколькі змянілася жыццё са з'яўленнем сына.**

**— Штурханне ядра праводзіцца ў першы дзень спаборніцтваў. Ці цяжка пачынаць, калі іншыя толькі акліматызуюцца і рыхтуюцца да старту?**

— Для мяне гэта плюс, бо мне лягчэй выступаць у першы дзень. Акрамя таго, я люблю паглядзець спаборніцтвы, а да свайго старту гэтага рабіць нельга. Я два дні з ахвотай правёў на стадыёне. «Хварэў» не за канкрэтных атлетаў, а за ўсю нашу зборную.

**— Вас абагналі толькі амерыканскія спартсмены. Чым жа Рыз Хофа і Адам Нельсан лепшыя?**

— Мы ж не веласіпедысты, каб абганяць адзін другога. Сапернікі мяне пераштурхнулі, — ці то правёў лікбез, ці то вырашыў пажартаваць Андрэй. — А перамаглі амерыканцы, бо, пэўна, аказаліся мацнейшымі і фізічна, і маральна, і ўдача была на іх баку. Лічу, што я па дзесяцібальнай шкале выступіў на 7, бо мне не хапіла 30 працэнтаў, каб паставіць «выдатна».

**— Не памылюся, калі скажу, што, безумоўна, на вынік паўплывалі нетыповы для беларуса клімат і розніца ў часе?**

— Так. У Японіі я быў упершыню і, зразумела, падрыхтавацца да такога выпрабавання не мог. Толькі калі нарадзіўся ў такіх кліматычных умовах, можаш адчуваць сябе ўтульна, а так ніколі не звыкнешся нават, калі загадзя да пачатку спаборніцтваў прыехаць. З цяжкасцю я перанёс і змену часавых паясоў. У абед хацелася спаць, а наперадзе былі спаборніцтвы. Канешне, усе былі ў аднолькавым становішчы, але ж у такіх умовах можна звар'яцець.

**— Акрамя негатыўных момантаў, ёсць станоўчыя ўражанні ад Японіі, дзе вы пабывалі ўпершыню?**

— Гэта вельмі развітая, цывілізаваная краіна са сваёй багатай культурай. Аднак для мяне шчыльнанаселеннасць Японіі — мінус, бо мне не падабаецца вялікая канцэнтрацыя машын і людзей. У горадзе адчуваў сябе быццам у муравейніку ці вялізным каменным мяшку. Самі японцы — вельмі прыемныя людзі і занадта старанныя. Яны з задавальненнем адгукаюцца каб дапамагчы. Праўда, калі табе кідаюцца дапамагаць чалавек 5—6, то цяжка прыйсці да кансенсусу, бо занадта многа камандзіраў у адным месцы.

**— Вам часта даводзілася звяртацца па дапамогу да японцаў?**

— Толькі, каб даведацца, дзе спыняецца аўтобус ці дзе браць ядры. Размаўляў з імі на англійскай мове.

**— Добра ведаеце яе?**

— Каб нешта спытаць, нармальна, а вось калі захачу пафіласофстваваць, то лексічнага запасу не хапае.

**— Жонка прасіла прывезці ёй сувенір з Японіі?**

— Наташа толькі сказала, каб я прывёз сябе.

**— А як жа медаль?**

— Не. Такога прасіць у спартсмена нельга, бо як я магу гарантаваць, што абавязкова прывязу ўзнагароду? Гэта тое ж самае, як прасіць прывезці грошы.

**— У сям'і спартсменаў часта гутараць аб спорце?**

— Канешне, у нас з Наташай ёсць агульная спартыўная тэма, але ўсе нюансы падрыхтоўкі, выступлення мы абмяркоўваем толькі са сваімі трэнерамі. Ведаю, што ў спорце ёсць прыклады, калі жонку трэніруе муж, але мы не з такіх, давяраем меркаванню спецыялістаў.

**— На каго падобны ваш сын — на Наташу ці на вас?**

— Я ўжо адказваў на гэта пытанне і больш не буду, бо дзеці так хутка мяняюцца. Няхай падрасце і стане больш відавочным, на каго з нас падобны болей.

**— Вам не было страшна ўпершыню браць у рукі дзіця?**

— Не. Страшна толькі, калі трымаеш чужое дзіця. Гэта тое ж, як вадзіць чужую машыну.

**— Вы будзеце строгім бацькам ці наадварот — станеце дазваляць сыну ўсё?**

— А хто ж ведае, якім я буду?

**— Чаму хлопчыка назвалі Ілля?**

— Мы доўга выбіралі імя, а на сямейным савеце вырашылі, што лепей за ўсё падыдзе Ілля.

**— Мужчыны ў асноўным жадаюць, каб нарадзіўся сын. Наколькі гэта было прынцыпова для вас?**

— Я быў бы рады і дзяўчынцы, і хлопчыку.

**— Якія ў вас планы пасля галоўнага старту сезона?**

— 22 верасня ў мяне фінал Гран-пры, а потым буду імкнуцца адчуць смак бацькоўства. Буду дапамагаць жонцы.

**— Наколькі часта вы бываеце ў родным Бабруйску?**

— Раней ездзіў часцей — раз у месяц. З нараджэннем дзіця ўсё змянілася. Мы ўжо не транспартабельныя. Зараз ужо бацькі будуць прыязджаць да нас у госці.

**— Чаго вам не хапае для поўнага шчасця? Камплект медалёў і сям'я ёсць...**

— Пакуль мне ўсяго дастаткова. Канешне, я хацеў бы, каб было яшчэ больш узнагарод і дзяцей. Аднак апошняе не толькі ад мяне залежыць. Я ведаю, што Наташа хоча вярнуцца ў спорт і паехаць на Алімпіяду. Як маці яна сябе ўжо рэалізавала і безумоўна зараз жадае задаволіць свае спартыўныя амбіцыі. А потым паглядзім.

**Ірына ПРЫМАК.**

## ПРЫТУЛІЎ ДЗЯДУЛЯ БАМЖЫХУ...

**І было гэта ў гарадскім пасёлку Васілевічы, што ў Рэчыцкім раёне. Гадоў каля шасці назад прытуліў. У яе — ні кала, ні двара. Нічога і нікога не было. У тым ліку і дзяцей, бо каму патрэбна была такая, што працаваць не хацела, а пасля заканчэння васьмігодкі блудзіла то па вясковых, то па гарадскіх сметніках?**

А якім чынам падкацілася да дзядулі з Васілевіч, як прыляпілася да яго, толькі ёй зараз і вядома. Напэўна, таму, што жыў ён у сваёй хаціне адзін, а сын і дочкі — асобна. Тыя бачылі, што робіць кабета з іхнім бацькам. Выносіла з дому прадукты харчавання, на цэлы тыдзень некуды знікала, потым зноў з'яўлялася, падбівала дзядулю на выпіўку, а пасля ўсё паўтаралася. Дабілася таго, што і пенсію за дзядулю атрымлівала. На «халяву» жыла, адным словам.

Дзеці настройвалі бацьку прагнаць кабету, а той — рогам: шкада яе, як аднаму быць? Тады вось і пайшла пагалоска па Васілевічах: няўжо дзядуля 76-гадовага ўзросту і малодка 33-х гадоў — такая «салодкая парачка», што не разліць яе вадой? Розныя размовы на гэты конт хадзілі, і ўсё ж пераважалі тыя, што, маўляў, дыму без агню не бывае.

У сярэдзіне ж сёлетняга студзеня пасля чарговай выпіўкі, калі малодка вярнулася аднекуль, дзядуля пачаў дапякаць яе, што яна «пракідвае» яго апошнім часам, не хоча «сужыцельстваваць». У чым справа, маўляў? Растлумач. Алкаголь разгарачыў абодвух. Пачаліся зневажанні, пагрозы, і дзядулевы нервы не вытрымалі такога напружання. Ён агрэў кабету палкай, што трапілася пад руку, і лёг на канапу. А калі задрамаў, яна падкралася да яго і кухонным нажом пачала наносіць удары адзін за адным.

Праз некалькі гадзін дзядуля сканаў, аб чым жанчына сказала суседцы, якая і выклікала міліцыю. Зараз бамжыха-забойца па прыгавору суда знаходзіцца ў выпраўленча-працоўнай калоніі агульнага рэжыму, дзе правядзе дваццаць гадоў. Там яе прымусова будуць лячыць ад хранічнага алкагалізму. Адкрытым застаецца пытанне выплаты ёю родным забітага 5 млн рублёў у якасці маральнай шкоды.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

Заснавальнікі — установа «Рэдакцыя газеты «Звязда» і грамадскае аб'яднанне «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі». Рэгістрацыйны № 12.

31 ЖНІЎНЯ 2007 г. ПЯТНІЦА № 36 (15487)

ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

**У НАВУЧАЛЬНЫ ГОД — З «СОНЕЧНЫМ НАСТРОЕМ»**

Адна з галоўных традыцый БДПУ — урачыстая сустрэча студэнтаў 1 верасня. Сёлета гэта ВНУ збіраецца сустракаць сваіх студэнтаў і выкладчыкаў яркай прэзентацыяй «Сонечны настрой». Дарэчы, выяву сонца ўтрымлівае і сімволіка БДПУ. Значыць, з самага першага дня вучобы і ўвесь будучы навучальны год святло і добры настрой павінны суправаджаць студэнтаў. А ўдзень у сценах БДПУ пройдзе прэзентацыя вядучых студэнцкіх калектываў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## Як граматна шукаць жыллё?

**У сувязі з актуальнасцю для студэнтаў напярэдадні новага навучальнага года пошуку і арэнды жылля, Міністэрствам юстыцыі былі праведзены праверкі рыэлтарскіх арганізацый, і па фактах выяўленых парушэнняў вінаватыя асобы прыцягнутыя да адказнасці.**

Адным з распаўсюджаных парушэнняў была адмова работніка рыэлтарскай арганізацыі назваць сваё прозвішча і пасаду па просьбе кліента. Гэта ёсць не толькі грубым парушэннем Правілаў прафесійнай этыкі, але і трывожным сігналам, паколькі могуць указваць на работу ў рыэлтарскай арганізацыі асобаў, афіцыйна не ўключаных у яе штат, — папярэджваюць спецыялісты Міністэрства юстыцыі. Пры рабоце з кліентамі спецыялісты па рыэлтарскай дзейнасці абавязаны прад'явіць ідэнтыфікацыйную пластыкавую картку незалежна ад таго, пацікавіўся ёй спажывец ці не. Рыэлтарская арганізацыі абавязаны таксама размяшчаць на інфармацыйных дошках для спажыўцоў побач з іншай неабходнай інфармацыяй спіс супрацоўнікаў, якія валодаюць ідэнтыфікацыйнай пластыкавай карткай з абавязковым тлумачэннем, што толькі наяўнасць гэтай карткі дае права працаваць з кліентамі.

Міністэрствам юстыцыі было таксама прапанавана рыэлтарскім арганізацыям разгледзець магчымасць прадастаўлення навучэнцкай моладзі скідак пры аплаце паслуг па пошуку жылля для яго далейшай арэнды.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

Наш фармат

### СВЯТА ДЛЯ ЎНІКАЛЬНЫХ ДЗЯЦЕЙ

**Днямі ў Мінску адбыўся I Рэспубліканскі фестываль юных талентаў — выхаванцаў спецыялізаваных дзіцячых дамоў і школ-інтэрнатаў «Мары здзяйсняюцца!».**

Праведзенне мерапрыемства наладзілі Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь, Дабрачыннае грамадскае аб'яднанне «Свет без межаў», рэдакцыя газеты для дзяцей і падлеткаў «Зорька» пры падтрымцы прадстаўнікоў дабрачынных арганізацый Швецыі і Польшчы. У праграме фэсту былі прэзентацыя альбома «Ты ўнікальны» і выставы дзіцячай творчасці, гала-канцэрт «зорачак» эстрады, сустрэчы з музыкантамі, паэтамі-песеннікамі, кампазітарамі, майстар-клас гасцей з Польшчы і Швецыі па арганізацыі творчых, музычных праектаў для дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, дэгустацыя кандытарскіх вырабаў і ўручэнне сувеніраў юным удзельнікам. Арганізатары перакананы, што менавіта такія акцыі дазваляюць падарыць свята дзецям, якім так не хапае радасці ў іх штодзённым жыцці.

**Ірына АНАТАВА.**

### РЭЙТАРЫ ПАСТАРАЛІСЯ

**Аддзел моладзі Рэчыцкага райвыканкама арганізаваў раённы фестываль «graffiti», які праходзіў у два этапы.**

У першым чатыры маладыя чалавекі на працягу цэлага месяца распісвалі тыльную сцяну даўжынёй у 115 метраў аднаго гаражнага кааператыва. На малюнках былі адлюстраваны капліца Ефрасінні Полацкай, Свята-Успенская царква, касцёл і іншыя славутасці горада. Атрымалася прыгожа.

У другім этапе ўдзельнічалі таксама рэйтары з Гомеля, Жлобіна, Калінкавіч, Мазыра і Светлагорска — усяго 14 чалавек. Даўжыня малюнкаў склала 138 метраў на жалезабетоннай агароджы, што на Светлагорскай шашы пры ўездзе з боку Мінска.

**Уладзімір ПЕРНІКАЎ.**

### РАШЭННЕ ГЛАБАЛЬНАЙ ПРАБЛЕМЫ

**Кожны падлетак ва ўзросце 9—14 гадоў можа сумясціць прыемнае з карысным: дапамагчы дарослым вырашыць праблему другаснага выкарыстання пластыка і дзякуючы сваёй вынаходлівасці атрымаць пуцёўку ў дзіцячы лагер «Зубраня».**

Менавіта такі прыз прыгатавалі для аўтараў 30 лепшых прац арганізатары конкурсу «Прыбяры сваю краіну». Ён праводзіцца ў Беларусі ўпершыню ў рамках міжнароднай сацыяльнай экалагічнай акцыі «JETIX* выратоўвае планету», якая дзейнічае на працягу трох гадоў у краінах СНД.

Конкурс «Прыбяры сваю краіну» мае адукацыйны і творчы характар. Акрамя «JETIX» яго арганізатарамі выступілі Міністэрства прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, Міністэрства інфармацыі, грамадскае аб'яднанне «Тэлекамунікацыйны галіновы саюз Рэспублікі Беларусь» і Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва. Чаму тэмай конкурсу выбралі менавіта перапрацоўку пластыкавых адходаў? Арганізатары перакананы, што праблема бяспечнай для здароўя чалавека ўтылізацыі прамысловых і бытавых адходаў зараз вельмі актуальная і носіць глабальны характар. Удзельнікі конкурсу могуць праявіць усе грані свайго таленту і палёт фантазіі: можна прадставіць пісьмовую працу на зададзеную тэму, даслаць матэрыял на відэа, стварыць выраб, прыдумаць варыянты карыснага выкарыстання пластыкавых бутэлек.

Працы можна дасылаць да 25 верасня на адрас: 220114, г. Мінск, вул. Макаёнка, 8, Рэспубліканскі экалагічны цэнтр дзяцей і юнацтва, тэл. 8 (017) 263 05 71. Журы адбярэ 30 лепшых прац. Пераможцы будуць адпачываць у дзіцячым лагеры «Зубраня» з 13 кастрычніка па 3 лістапада (у гэты тэрмін будзе праходзіць экалагічная праграма «Эка-Дыліжанс»). Таксама запланаваны сувеніры ад «JETIX». Урачыстая цырымонія падвядзення вынікаў адбудзецца 13 кастрычніка ў Рэспубліканскім экалагічным цэнтры дзяцей і юнацтва. Аб ходзе акцыі можна азнаёміцца на сайце www.jetix.by.

**Ірына ПРЫМАК.**

**JETIX — тэлевізійны забаўляльны канал для дзяцей ва ўзросце 6—14 гадоў у 58 краінах свету на 18 мовах.*

Герой нашага часу

# СПАРТСМЕН З ЗАЛАТЫМІ РУКАМІ

**У яго залатыя рукі, бо інакш пра спартсмена, які тры чэмпіянаты свету запар заваёўвае «золата», і не скажаш. Ён моцны фізічна і маральна і вельмі ўпэўнены ў сабе (каб не сурочыць!). Аб сваім нядаўнім подзвігу ў японскім сектары (інакш кідок за 83 метры ў апошняй спробе не назавеш) лёгкаатлет гаворыць проста: «Калі ў мяне захоўваецца хоць адна спроба, ніколі не губляю надзеі, ды і мая работа — паказваць добры вынік». Ён выхоўвае чатырохгадовага сына, на чэмпіянаце свету ў Осацы ў рамках адной з акцый пасадзіў дрэва на шчасце, а зараз плануе пабудаваць дом у Гродне, дзе жыве разам з жонкай Вольгай. Так што неўзабаве праграма-мінімум для мужчыны ў беларускага асілка будзе выканана. Герой нашай сённяшняй рубрыкі — сярэбраны прызёр летніх Алімпійскіх гульняў у Афінах Іван Ціхан, які днямі зноў праславіў сваю родную вёску Глоўсевічы Слонімскага раёна і ўсю Беларусь таксама.**



Фота Вольгі ЛАСКА.

Больш за астатніх сустракаючых Івана Ціхана чакала жонка.

### «Муж прасіў не перахваліць»

Нягледзячы на позні прылёт самалёта з чэмпіёнам на борце (было за 23 гадзіны), у «Мінску-2» сабралася дастаткова сустракаючых. Яны прынеслі з сабой кветкі і плакаты з выявай спартсмена ў сектары. «Мы проста не ведаем, як Ціхан выглядае, таму і прынеслі плакаты, каб ён адразу да нас падышоў», — пажартаваў прадстаўнік федэрацыі па лёгкай атлетыцы. Настрой у яго, зразумела, пасля трэцяй вікторыі быў цудоўны. Сціпла трымалася побач жонка Івана — Вольга. У мінулым яна таксама лёгкаатлетка (праўда, выступала ў кіданні дыску і за Расію), таму разумее, што такое жыццё спартсмена са зборамі, трэніроўкамі, спаборніцтвамі. Пакуль Вольга чакала свайго «залатога» мужа, мы разгаварыліся.

— Кожны раз я сустракаю Ваню па-новаму. Думаю, зараз нешта арыгінальнае таксама прыдумаю, — кажа Вольга. — Паспрабую прыгатаваць нешта смачнае, хоць Іван не гурман і есць усё. Дарэчы, да сустрэчы рыхтуюся не толькі я, але і нашы суседзі. Яны ўжо пыталіся, калі Ваня прыедзе, каб сустракаць яго з застоллем і плакатамі. Асабліва радуюцца дзеці, калі муж дазваляе ім надзець свае медалі і сфатаграфавацца з імі.

**— Хоць вам і знаёма жыццё спартсменаў, усё ж цяжка быць жонкай атлета, які не часта бывае дома. Вы не адчуваеце сябе жонкай марака?**

— Быць жонкай чэмпіёна прыемна, ды і я часта езджу за мужам з дзіцем, таму мне не настолькі цяжка, як жонцы марака.

**— У Осацы ў Івана не адразу ўсё пачало атрымлівацца ў сектары. Калі б вашаму мужу не ўдалося ўзысці на п'едэстал, што б вы яму сказалі?**

— Папракаць не стала б дакладна. Ён жа заўжды змагаецца. Я веру ў мужа і лічу, што яго чакае яшчэ большая будучыня. Спартыўная.

**— Ці дапамагае вам ён па гаспадарцы?**

— Нават любіць гэта. Аднак яму рэдка ўдаецца нешта зрабіць, бо ён рэдка прыязджае ў Гродна. За год бывае дома тыдні два, а астатні час — у «Стайках» трэніруецца і спаборнічае.

**— Якія словы сказаў вам муж, калі тэлефанаваў з Японіі?**

— Ой, не аб сваім «золаце». Я пачала яго віншаваць, а ён папрасіў не перахваліць і спытаў, як справы.

**— Што, на ваш погляд, дазваляе Івану заставацца сціплым, нягледзячы на славу вялікага спартсмена?**

— Думаю, што выхаванне. Гэта закладваецца з дзяцінства (дарэчы, сям'я Вані была шматдзетнай — **Аўт.**).

**— Чым ён заваяваў ваша сэрца?**

— Ён прыгожы мужчына *(усміхаецца).*

**— Вы паехалі з роднай Расіі за мужам быццам жонка дзекабрыста...**

— Мне падабаецца Гродна, таму я не шкадую, што жыву ў Беларусі. Там у мяне ёсць сябры. Праўда, мне падаецца, што з часам нам давядзецца жыць у Мінску, бо там сабрана ўсё, што звязана са спортам.

### Прадмова да Алімпіяды ў Пекіне

Іван Ціхан зусім не здзівіўся вялікаму натоўпу сустракаючых яго ў аэрапорце і ўвазе журналістаў. Заўважу, што ў параўнанні з некаторымі іншымі чэмпіёнамі з Беларусі, ён не падганяў і не казаў «у мяне толькі 5 хвілін, апошняе пытанне, калі ласка», а адказваў столькі, колькі яго «атакавалі» прадстаўнікі СМІ. Пацікавіцца ў Вані, безумоўна, было чым. «Як мне стаць, дастаць рукі з кішэняў?» — усміхнуўся чэмпіён тэлевізійнікам, быццам яго ў першы раз здымаюць на камеру.

— А што мне ўжо казаць? — першым нечакана задаў пытанне сам спартсмен. — У мяне ўжо японскія журналісты ўсё выпыталі. Я падзякаваў гледачам, якія падтрымлівалі, арганізатарам спаборніцтваў. Дарэчы, у Японіі мясцовы кідальнік молата Мурафушы — нацыянальны герой, таму і мяне пасля перамогі японцы ўспрынялі так жа. У гасцініцы, дзе я жыў, мне нават торт паднеслі.

**— У вас за плячыма ўжо два залатыя чэмпіянаты свету. Чым для вас адметна першынство ў Осацы?**

— Адлегласць іншая, — усміхнуўся Іван. — Кожны чэмпіянат па-свойму цяжкі, таму ў асноўным для мяне ўсе спаборніцтвы аднолькавыя. Што да клімату, то ў гэтым плане я не адчуў дыскамфорту.

**— Наколькі японская спякота і вільготнасць дазволілі адчуць умовы, у якіх вам давядзецца выступаць на Алімпіядзе ў Пекіне, дзе абяцаюць невыноснае пекла?**

— Гэта немагчыма параўноўваць! Хоць умовы падобныя, але заўтра я магу ўстаць з іншым настроем і, магчыма, нешта не паладзіцца. Наступны год пакажа.

**— Трэцяе сусветнае «золата» — кропка ці шматкроп'е?**

— Хутчэй прадмова да Алімпійскіх гульняў. На чэмпіянат свету я ехаў з мэтай падрыхтоўкі да Пекіна. У прынцыпе, я пачаў рыхтавацца да наступнай Алімпіяды адразу пасля Афінаў. Не бывае такога, каб за адзін год можна было б падрыхтавацца да Алімпіяды.

**— Вы што, не адпачываеце наогул?**

— Лёгкая атлетыка вельмі насычаная спаборніцтвамі. У нас у верасні яшчэ пяць стартаў. Апошні будзе зноў у Японіі. Адпачынак для мяне — змена дзейнасці: трэніровачны працэс ці спаборніцкі. Шкада губляць час перад Алімпіядай.

**— Як вы ацэньваеце сваіх сапернікаў у перадалімпійскі год? Каго лічыце асноўнымі канкурэнтамі?**

— Ніхто новы не з'явіўся, і ўжо гэта прыемна. Яшчэ зімой я адзначыў для сябе славенца, які быў зараз другім, і славака, які стаў трэцім. У іх я пабачыў добрую школу і свежасць. Аднак пралічыць, што яны пакажуць на Алімпіядзе, цяжка. Адзначу і японца Мурафушы, які выйграў у мяне на мінулых Алімпійскіх гульнях і на Кубку свету (я перамог яго на чэмпіянаце свету ў Парыжы-2003). Не разумею, чаму ў Мурафушы не склалася ў Осацы, бо дома, як вядома, і сцены дапамагаюць. Спісваць яго з рахунку сапернікаў у Пекіне я не стаў бы.

**— Чым вы растлумачыце свае няўдачы ў кіданні молата? Залатой аказалася толькі апошняя спроба...**

— Ці ж гэта няўдачы? Эмоцыі станоўчыя былі? Усё, значыць, астатняе яны перакрываюць. Я разумею, што за мяне перажывалі, трэніровачны шлях таксама цяжкі, але канчатковы вынік паглынае ўсе складанасці.

**— Як лічыце, калі б у ранейшых спробах вы паказалі такі ж вынік — 83,63 — нехта з сапернікаў мог бы яго перакрыць?**

— Я не прыхільнік разваг на тэму «Вось калі б...». Ёсць рэальнае жыццё. Ці можна казаць: калі б Ваня кінуў за 86, іншыя б паўтарылі? Сапернікі ў мяне былі моцныя. Магчыма, яны ставілі іншыя задачы на спаборніцтвы, бо хацелі б — паказалі б лепшы вынік.

**— І ўсё ж, прызнайцеся, ці была апошняя спроба хатняй загатоўкай?**

— Ну, што вы. Я пралічваю тактыку на перамогу, але немагчыма ведаць як складзецца. Існуе шэсць спроб, і ў іх трэба выкласціся. Калі не трапіў у рух, то, выбачай, але давядзецца ўступіць іншаму. Мяркую, сапернікі мне дапамаглі ў тым плане, што сваімі вынікамі падштурхнулі мяне завесціся і сабрацца.

**— Чым вы харчаваліся ў дзень спаборніцтваў, каб сіл хапіла?**

— Я браў з сабою з дому паляндвіцу, чорны хлеб, каўбасу, бо ўсе гэтыя дні я жыў па беларускім часе, калі сталовая ўжо не працавала.

**— Вам хапіла запасаў?**

— Думаеце, я шмат ем? Вы, здаецца, больш.

**— У час спаборніцтваў парвалася сетка. Гэта не перашкаджала настрою на барацьбу, не выбівала з рытму?**

— Калі рыхтуешся да спаборніцтваў, гатовы да ўсіх нюансаў. Для мяне не бывае нічога нечаканага.

**— Сыну передасце свае чэмпіёнскія сакрэты?**

— Няхай выбірае, ці займацца спортам, а там паглядзім.

— Мы Ваню хутчэй за ўсё аддадзім не ў кіданне молата, а ў гімнастыку, — дадае Вольга.

**— Вы адзін з нямногіх спартсменаў, хто ведае словы нашага гімна і спявае яго...**

— Неяк перадавалі па тэлевізару, што італьянец, які прыехаў трэніраваць расіян па валейболу, першай справай прымусіў вывучыць гімн. Гэта правільна, бо калі ўздымаецца сцяг, у душы штосьці там аддае. Гэта непавага, калі народ на цябе глядзіць на п'едэстале, а ты маўчыш.

**Ірына ПРЫМАК.**

**P. S.** *Івана Ціхана, нягледзячы на яго поспехі, нельга аднесці да любімчыкаў фартуны. На Алімпіядзе ў Сіднеі ён заняў самае крыўднае 4 месца. Магчыма, гэта і распаліла ў спартсмене жаданне заўжды імкнуцца станавіцца першым. У багатай калекцыі яго ўзнагарод не хапае толькі алімпійскага «золата». Нагадаю, што сярэбраным прызёрам Алімпіяды ў Афінах беларус стаў, дзякуючы дыскваліфікацыі ўладальніка «срэбра» з Венгрыі. Паўнавартаснай задаволенасці ад такога ў Івана, зразумела, быць не магло. Пажадаем нашаму чэмпіёну здароўя, удачы, а далейшага ён дасягне сваёй упартасцю і працавітасцю. А яшчэ хочацца сказаць «дзякуй» надзейнаму тылу малатабойца — яго жонцы Вользе, якая заўжды верыць у свайго мужа.*

## «Кобрын-2007» — турнір для інтэлектуалаў

**У Кобрыне прайшоў міжнародны юнацкі турнір па шахматах, у якім прымалі ўдзел 182 юныя шахматысты з Беларусі і Расіі.**



Сярод прыехаўшых у Кобрын беларускіх спартсменаў — пераможцы і прызёры першынства Беларусі ў сваіх узроставых катэгорыях гэтага і мінулых гадоў, у тым ліку і тыя, хто рыхтуецца да ўдзелу ў першынстве Еўропы ў Харватыі ў верасні і ў першынстве свету ў Турцыі ў лістападзе.

Спаборніцтвы праводзіліся па швейцарскай сістэме ў дзевяць тураў у двух узроставых катэгорыях: 1992 года нараджэння і маладзей, а таксама 1996 года нараджэння і маладзей. Акрамя таго, спаборнічалі паміж сабой і 24 шахматысты без абмежавання ўзросту, якія маюць міжнародны рэйтынг. У гэтым турніры ўзровень удзельнікаў не ніжэй кандыдатаў у майстры спорту.

— Мерапрыемствы такога плану садзейнічаюць папулярызацыі шахмат, развіццю міжнародных шахматных сувязяў і падрыхтоўцы перспектыўнага рэзерву. У прыватнасці, у кобрынскім турніры ў розныя гады прымала ўдзел большасць членаў цяперашняй нацыянальнай зборнай па шахматах, у тым ліку Аляксей Аляксандраў, Ганна Шарэвіч, Андрэй і Сяргей Жыгалка, Таццяна Мартынюк, — адзначыў галоўны суддзя спаборніцтваў — міжнародны арбітр Вячаслаў Эльберг.

Арганізатарамі міжнароднага юнацкага турніру па шахматах «Кобрын-2007» выступілі Беларуская федэрацыя шахмат, Рэспубліканскі цэнтр алімпійскай падрыхтоўкі па шахматах і шашках і Кобрынская дзіцяча-юнацкая школа алімпійскага рэзерву. Упершыню турнір быў праведзены ў 1984 годзе. Традыцыйна ён праходзіць у канцы жніўня. З 1993 па 1997 год турнір не праводзіўся, але потым быў узноўлены.

**Марына ПЫРКОВА.**

## Рэйд у пошуках «нябачных» пешаходаў

*«Неабазначаныя» флікерамі на цёмных кавалках дарогі пешаходы пачалі плаціць штрафы.*



— Мы амаль два гады папярэджвалі пешаходаў, раздавалі флікеры, — каментуюць удзельнікі рэйду старшы інспектар УДАІ Андрэй Шаранда і старшы інспектар ДПС «Страла» Андрэй Пярвухін . — Але ўсё роўна колькасць наездаў на «неабазначаных» людзей застаецца вялікай. Таму было прынята рашэнне перайсці да пакарання ў адміністрацыйным парадку — папярэджанне або штраф да 0,5 базавай велічыні, а гэта 15 500 рублёў.

Падчас аднаго рэйду, які прайшоў у Мінскім раёне, было затрымана 562 пешаходы, што парушалі правілы дарожнага руху. На працягу ўсёй акцыі, якая праводзіцца з 20 жніўня, аштрафавана 2482 пешаходы. З усімі правялі прафілактычную размову. «Абазначаныя» пешаходы атрымалі ў якасці падарунка ад ДАІ флікер, а парушальнікі заплацілі штраф. Такія рэйды працягваюцца на тэрыторыі ўсёй краіны.

**Марына БЕГУНКОВА. Фота аўтара.**

## ШКОЛЫ БУДУЮЦЦА

У новым навучальным годзе на Віцебшчыне будзе завершана будаўніцтва некалькіх аб'ектаў адукацыі. У прыватнасці, дабудавалі другую чаргу полацкай сярэдняй школы № 18, што знаходзіцца ў мікрараёне «Аэрапорт». Яна разлічана на 475 вучняў. Будзе прыбудова на 440 вучняў і ў СШ № 1 у Глыбокім.

Сёлета, згодна з прэзідэнцкай праграмай «Дзеці Беларусі», плануецца ўвесці ў эксплуатацыю культурна-аздараўленчы цэнтр Лужаснянскай школы-інтэрната, дзе вучацца таленавітыя дзеці, што ў прыгарадзе Віцебска. У першым паўгоддзі тут была здадзена «пад ключ» вялікая актавая зала. Да канца года неабходна завяршыць работы па рэканструкцыі вучэбнага корпуса пад медыцынскі блок, дзіцячы садок дзённага знаходжання на 90 месцаў і вучэбна-бытавых пакояў у Друйскім дзіцячым доме. Будуць пабудаваны жылыя дамы для сямей, якія выхоўваюць дзяцей-сірот і тых, хто застаўся без апекі бацькоў, у Глыбоцкім і Верхнядзвінскім раёнах.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## «ЛІДАР» — УНІКАЛЬНЫ ПРАЕКТ БРСМ


Фота БЕЛТА.

Адзіны ў нашай рэспубліцы лагер ініцыятыўнай моладзі «Лідар», што пяты год запар працуе на Віцебшчыне недалёка ад вёскі Старое Сяло Віцебскага раёна пад эгідай БРСМ, завяршыў сваю юбілейную змену. Гэты факт сімвалічны перад наступаючым (таксама 5- гадовым) юбілеем БРСМ.

Як паведаміла карэспандэнту «Звязды» кіраўнік лагера самай масавай моладзевай арганізацыі Беларусі, педагог-арганізатар Ганна Піменава, у лагеры, арганізаваным на базе летніка «Лясная паляна», адпачывалі і абменьваліся вопытам работы з равеснікамі каля 100 актывістаў БРСМ ва ўзросце ад 14 да 18 гадоў з усіх рэгіёнаў Прыдзвінскага краю. Хлопцы і дзяўчаты па добрай традыцыі ўдзельнічалі ў трэнінгах, бралі ўдзел у розных інтэлектуальных праектах, выпускалі ўласную газету «Штурм». Адбыўся «Дзень дублёра», ажыццявілі праект мастацтваў «Арбат». Наведалі выхаванцаў інтэрната ў вёсцы Вялікія Лётцы, падрыхтавалі ім сюрпрызы (у ліку іншых прывезлі гумавы басейн). Цікава, што былыя выхаванцы лагера становяцца выхавальнікамі. Некаторыя не толькі сябруюць і далей пасля завяршэння змены, але і ствараюць сем'і!

Паводле слоў другога сакратара Віцебскага абкама БРСМ Людмілы Капранавай, колькасць членаў БРСМ на Віцебшчыне набліжаецца да 57 тыс. чалавек, працуе звыш 1,9 тыс. пярвічных арганізацый.

Па выніках мінулага года, абкам БРСМ, а таксама райкамы Міёрскага і Глыбоцкага раёнаў, гаркамы Полацка і Оршы сталі пераможцамі рэспубліканскага конкурсу, арганізаваным ЦК БРСМ у розных намінацыях.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

## КАЛІ ІДУЦЬ У ПЕРШЫ КЛАС

**У першы клас я ісці баялася. І першыя тыдні ў школе не памятаю. У гэтым годзе ў школу пойдзе мая пляменніца. Аднак я не ведаю, хто больш хвалюецца — яна ці яе матуля. Пачатак школы — гэта стрэс, прытым для ўсёй сям'і.**



Як псіхалагічна падрыхтаваць шасцігадовае дзіця да школьных будняў? Як паводзіць сябе бацькам? Што лепш: гімназія ці школа? Каб атрымаць адказы, я звярнулася да псіхолага гімназіі горада Добруша. Тамара Міхайлаўна Недава — псіхолаг са стажам, пераможца раённага конкурсу прафесійнага майстэрства і проста чалавек, які любіць сваю працу.

Першую праблему, якую мы абмяркоўвалі, я ўмоўна назвала «сіндром невялікага горада». У Добрушы чатыры школы і адна гімназія. Зразумела, што больш прэстыжна вучыцца менавіта ў гімназіі. Аднак дзіця павінна прайсці субяседаванне, пасля якога некаторым бацькам карэктна рэкамендуюць аддаць яго ў сярэднеадукацыйную школу. Там дзіця будзе трымацца на сярэднім узроўні, а ў гімназіі хутчэй за ўсё трапіць у лік слабых вучняў. Аднак не ўсе бацькі разумеюць гэта і ўсяляк спрабуюць усё ж «уладкаваць» сваё дзіця ў гімназію.

— Перш за ўсё бацькі павінны думаць аб дзецях, — падкрэсліла Тамара Недава. — Трэба выбіраць не школу, а настаўніка. Яшчэ адна вялікая памылка бацькоў — імкненне рэалізаваць свае нерэалізаваныя амбіцыі на дзецях. А гэта ўжо не толькі безвыніковыя спробы, але і дадатковы стрэс для першакласніка.

Школа — ужо не гульні ў садку. Трэба чатыры ўрокі быць уважлівым, слухаць настаўніка і сядзець на адным месцы. І цяжка гэта для дзяцей не толькі псіхалагічна, але і фізічна. Таму падтрымка бацькоў першакласніку неабходна. Рыхтуючыся да першага верасня, таты і матулі самі вельмі хвалююцца. І гэтыя перажыванні, няўпэўненасць і разгубленасць могуць перадацца дзецям, што не паспрыяе спакойнай адаптацыі да школы.

— Па-першае, неабходна супакоіцца самім бацькам, каб іх хваляванні не перадаліся малому, — тлумачыць Тамара Міхайлаўна. — Па-другое, дзіця павінна разумець адрозненне паміж садком і школай, выхавальнікам і настаўнікам, заняткамі-гульнямі і ўрокамі. Трэба не толькі размаўляць, але і займацца з будучым першакласнікам. І рабіць гэта, зразумела, не ў апошні тыдзень. Па-трэцяе, адразу лепш падрыхтаваць сына ці дачку да дрэнных адзнак, каб выпадковыя няўдачы не ператварыліся ў трагедыі. Можна, напрыклад, расказаць, як тата ці маці самі атрымлівалі нізкія балы, але нічога страшнага не здарылася.

Усім вядома, што вучыцца пісаць, чытаць, лічыць, развіваць міміку, памяць дзеці павінны яшчэ да школы. Заняткаў у садку недастаткова, таму асноўная праца павінна быць дома, з бацькамі. Каб першакласнік адчуваў сябе больш упэўнена, ён не павінен лічыць сябе горшым за іншых. Таму нельга параўноўваць яго поспехі і памылкі з дасягненнямі яго сяброў. Калі з першых дзён сын ці дачка не хочуць хадзіць у школу, бацькам трэба высветліць сапраўдную прычыну. Можа, дзіця пакрыўдзілі ў класе, можа, нешта аднойчы не атрымалася, з-за чаго настрой рабіць усё астатняе знік. Але ні ў якім выпадку нельга адразу крычаць, караць — гэта можа прывесці да нежадання дзіцяці наогул дзяліцца з бацькамі сваімі праблемамі і нават радасцямі.

— Акрамя заняткаў, у першакласніка павінна быць дастаткова часу на адпачынак, — падкрэсліла падчас размовы Тамара Міхайлаўна. — Яму неабходна высыпацца. Не трэба з першых дзён у школе нагружаць дзіця нейкімі гурткамі, дадатковымі заняткамі, секцыямі. Лепш даць яму магчымасць потым выбраць секцыі і гурткі самастойна.

Кажуць, маленькія дзеткі — маленькія бедкі. Я спадзяюся, што для маёй пляменніцы і для ўсіх хлопчыкаў і дзяўчынак, якія ідуць у першы клас, 1 верасня будзе святам не толькі ў гэтым годзе...

**Настасся КАРАЦЕЕВА.**

# «ЗАХВАРЭЦЬ» І ПАЛЮБІЦЬ «ДРАКОНАЎ»

**Трэці хакейны сезон дзяўчаты танцавальна-спартыўнага ансамбля «Глорыя» ліцэя БДУ з'яўляюцца групай падтрымкі мінскага «Кераміна». З чырлідэрамі (менавіта так называюць танцоўшчыц з пампонамі, якія «хварэюць» на матчах за сваю каманду — Аўт.) «Звязда» ўжо знаёміла сваіх чытачоў, калі яны толькі з'явіліся ў беларускім спартыўным свеце. Тады размова ішла аб групе падтрымкі хакейнага клуба «Юнацтва-Мінск», на базе якога і зарадзіўся чырлідэрскі рух у нашай краіне. Аднак з таго часу многае змянілася: хоць дзяўчаты з «Юнацтва» былі першымі гістарычна, затое першымі ў плане запатрабаванасці сталі чырлідэры «Кераміна». Іх можна пабачыць не толькі на пляцоўцы «драконаў», але і на самых розных спаборніцтвах: напрыклад, выступаюць яны перад выхадам на поле нацыянальнай футбольнай зборнай Ь перад матчамі Кубка Дэвіса, на турнірах па лёгкай атлетыцы, боксу, баскетболу і г. д. Прызнаюся, калі мы вырашалі, якую з груп падтрымкі запрасіць на прэзентацыю нашай газеты на выставах, без сумненняў аддалі перавагу «Глорыі».**



Фота Вольгі ЛАСКА.

Вылучаецца «Глорыя» яшчэ адной акалічнасцю: ні ў якой іншай групе падтрымкі на матчах не танцуе ...юнак. Гэта 12-гадовы Алег Паляшчук. Думалі нават зрабіць для яго касцюм дракончыка, каб ён забаўляў гледачоў на матчах, але вучань сёмага класа СШ № 125 з большым задавальненнем танцуе, таму пакуль дырэктар клуба заказаў для яго танцавальны касцюм. Спачатку Алег прыходзіў у Лядовы палац паглядзець хакей, а потым (сведкай гэтага я была неаднойчы) паступова пачаў прытанцоўваць на трыбунах, паўтараючы рухі чырлідэраў. Зараз юнака доўга шукаць на арэне не трэба: ён танцуе побач з шасцю дзяўчатамі з «Глорыі». «Мне падабаецца танцаваць, — прызнаецца Алег. — Праўда, ёсць музыка, пад якую рухацца ў мяне не заўжды атрымліваецца. Я не стамляюся ад танцаў і рукі ў мяне не баляць, бо гэта для мяне няцяжка». Дарэчы, ён хоць і любіць хакей, але займаецца ў футбольнай школе.

*Калі Алега ў групу падтрымкі прывяла любоў да хакея і «Кераміна» ў прыватнасці, то дзяўчаты, наадварот, спачатку сталі выступаць на матчах і толькі потым паступова пачалі «хварэць» за «драконаў», пасапраўднаму палюбілі гэту каманду.*

— Раней мы не ведалі ніводнага іграка і, канешне ж, спецыфікі хакея, — узгадвае Кацярына Аношка, — а зараз знаёмы з кожным хакеістам і з цікавасцю сочым за іх гульнёй. Для групы падтрымкі галоўнае — перадаць дух матча, — перакананая студэнтка другога курса юрфака БДУ. — У нас гэта атрымліваецца без праблем, бо калі наша каманда выйграе, мы крычым і радуемся. Калі ж нашы прапускаюць гол, то, зразумела, настрой і музыка ў нас адпаведныя. Тут і прыкідвацца не трэба, бо «Керамін» стаў нашай любімай камандай і мы за яе «хварэем».

Дзяўчаты з «Глорыі» расказалі пра кур'ёзы, якія здараліся з імі на матчах. Калі яны толькі пачыналі выступаць, адразу не маглі запомніць парадак усіх рухаў і ... карысталіся шпаргалкамі. Неяк шайба трапіла ў мажарэтку дзяўчыны, якая стаяла крайняй злева. Яна спачатку нават не зразумела, што адбылося. Быў выпадак, калі балельшчыкі з першага рада ў час гульні прапаноўвалі чырлідарам пачастунак. Адзін з прыхільнікаў нават прынёс для ўсіх шакаладкі. Дарэчы, дзяўчаты з «Глорыі» адразу расставілі ўсе кропкі над і ў адносінах з балельшчыкамі, якія просяць у іх нумары тэлефонаў ці запрашаюць схадзіць у кіно. Захапляцца танцамі чырлідараў можа кожны балельшчык, але ніякіх іншых адносінаў паміж імі быць не можа, ды і навошта ім гэта, калі ў такіх прыгажунь ужо ёсць маладыя людзі. Дзяўчаты прызнаюцца, што большасць з апошніх хакеем не надта цікавяцца, а на матчы прыходзіць толькі, каб на сваю каханую паглядзець. «Ніякай рэўнасці ў майго юнака не ўзнікае. Ён толькі дзівіцца, наколькі моцна ўсе мы хвалюемся за хакеістаў, калі іх ударыць, ці нашым шайбу закінуць, — распавядае Каця. — Зразумела, што так і павінна быць, бо мы — група падтрымкі і таму нам не абыякава ўсё, што адбываецца на пляцоўцы». «А мой юнак наогул не прыходзіць на хакей, бо ён яму нецікавы, — расказвае будучы менеджар па турызму Паліна Высоцкая. — Дарэчы, калі наша каманда гуляе ў гасцях, мы прыходзім на яе паглядзець ці сочым за сустрэчай па тэлевізару, бо вельмі пранікліся духам хакею».

Паводле слоў кіраўніка «Глорыі» Вольгі Гусінец (менавіта яна прыдумвае ўсе танцы), у групу падтрымкі зараз уваходзіць дзесяць чалавек ва ўзросце ад 18 да 25 гадоў. За матч чырлідарам даводзіцца станцаваць прыкладна 60 заставак (дзесьці 30 у перыяд), што раўняецца 8—10 паўнавартасным танцам у канцэртнай праграме. «Раней мы спрабавалі экспромт, але як прафесіянал я вам скажу, што лепшы экспромт — адрэпеціраваны танец. Дарэчы, нешта сёння мы мала танцуем, — заўважыла кіраўнік «Глорыі», калі «Керамін» сустракаўся ў фінале Кубка Беларусі з «Гомелем». — Толькі 16 трэкаў за перыяд! Значыць, моцныя каманды сёння, бо гульня мала спыняецца». Наогул дзяўчаты «Глорыі» маюць у сваёй калекцыі застаўкі да 90 трэкаў. «У нас больш просяць танцаваць пад цяжкую музыку, бо яна адпавядае характару хакея, — працягвае гутарку Вольга Гусінец. — Аднак працаваць толькі пад рок цяжка, ды і рухі для яго прыдумваць не так лёгка, таму мы выкарыстоўваем і іншую музыку. У планах у мяне падзяліць музыку на блокі, каб у першым перыядзе, калі гульня толькі пачынаецца, музыка была нейтральная, у другім — лацінаамерыканская, таму што лёд ужо накаліўся ад барацьбы, а ў трэцім — больш імпульсіўныя, бо гэта самы важны адрэзак сустрэчы». Што ж датычыць меркавання саміх ігракоў наконт музыкі, то, як мне расказалі дзяўчаты з «Глорыі», «хакеістам на самай справе гэта абыякава, бо ў час гульні яны настолькі канцэнтруюцца на ёй, нават калі на лаўцы сядзяць, што нічога не заўважаюць, а музыка мае значэнне толькі для балельшчыкаў, каб задаваць ім настрой».

З новага сезона чырлідары «Кераміна» крыху зменяць свой імідж. На матчах чэмпіянату Беларусі дзяўчат можна будзе пабачыць не ў кепках, а ў палосках, вопратка стане больш спартыўнай (спадніцы і боdзі) і стыльнай. Удасканальвацца і развівацца падштурхоўвае канкурэнцыя паміж групамі падтрымкі, якія ёсць амаль ва ўсіх хакейных камандах. Сярод іх нават праводзіцца конкурс, і «Глорыя» ўжо была прызнана лепшай групай падтрымкі.

Культура чырлідарства прыйшла да нас з Захаду і многія зараз мараць трапіць у групу падтрымкі. Як гэта зрабіць? «Канешне, адразу трэба паглядзець, што ўмее дзяўчына, — кажа Вольга Гусінец. — Новенькай патрэбна вывучыць усе нашы танцы. Толькі пасля гэтага яе можна будзе ўключыць у склад чырлідараў на матч». Дарэчы, у «Глорыі» акрамя спартыўнага накірунку ёсць і іншыя (танцы народаў свету і эстрадныя), таму кожны, хто любіць танцаваць і не ведае, куды запісацца, можа прыходзіць у ліцэй БДУ.

**Ірына ПРЫМАК.**

**Прашу слова!**

# Тэсціраванне павінна арыентавацца на добра падрыхтаваных абітурыентаў...

**Сёлетняя ўступная кампанія завяршылася. Спецыялісты падводзяць і аналізуюць яе вынікі, выказваюць свае думкі па розных спрэчных пытаннях сістэмы цэнтралізаванага тэсціравання. Як вядома, адным з найбольш вострых з'яўляецца пытанне аб ступені складанасці тэставых заданняў. Спадзяюся, што і мая думка будзе неабыякавай як спецыялістам, так і абітурыентам.**

Рыхтуючы сваіх вучняў да ўступных іспытаў па рускай мове і аналізуючы затым вынікі, атрыманыя імі на тэсціраванні, разбіраючы тэставыя заданні і памылкі, дапушчаныя маімі падапечнымі, я прыйшоў да аднназначнай высновы — узровень заданняў цэнтралізаванага тэсціравання адпавядае школьным праграмам. Заданні складзены прафесійна, граматна і закранаюць усе раздзелы і тэмы школьнага курсу. Асобныя заданні тэстаў, магчыма, і патрабуюць дадатковых ведаў, але гэта зусім натуральна, бо абітурыенты павінны валодаць не толькі базавым праграмным матэрыялам, але і дадатковым. Узровень ведаў павінен быць хоць бы крыху вышэйшым за сярэдні. Так, ёсць заданні няпростыя, якія патрабуюць ведаў не толькі па канкрэтнаму прадмету, але і ведаў сумежных прадметаў, умення лагічна мысліць, аналізаваць, творча падыходзіць да выканання тэстаў. Гэта значыць, што недастаткова проста вывучыць правілы, тэрміны і паняцці. І зусім немагчыма падрыхтавацца да тэсціравання за кароткі тэрмін, нават з дапамогай рэпетытара. На мой погляд, ні адзін рэпетытар не можа даць ніякіх гарантый. Тэсты не выклікаюць цяжкасцяў толькі ў тым выпадку, калі ў навучэнцаў будуць стабільныя веды за курс сярэдняй школы. Падрыхтоўку трэба весці па школьных падручніках, звяртаючы ўвагу на ўсялякія заўвагі, дадатковы матэрыял, даведкі і практыкаванні. Па кожнаму раздзелу праграмы пажадана парашаць адпаведныя тэсты, балазе, дапаможнікаў для падрыхтоўкі да тэсціравання цяпер на кніжным рынку вялікае мноства. І, канешне ж, проста неабходна прапрацаваць заданні са зборнікаў тэстаў, рэкамендаваных Рэспубліканскім інстытутам кантролю ведаў. Асаблівую ўвагу калег і абітурыентаў хачу звярнуць на дапаможнік РІКВ «Рыхтуемся да цэнтралізаванага тэсціравання» (Мінск: «Аверсэв» 2007), у якім дадзены каментарыі і парады па выкананню тэставых заданняў, аналіз характэрных дапушчаных памылак і трэніровачныя заданні. Шматгадовы вопыт работы ў школе і гімназіі дазваляе мне гаварыць аб тым, што якія б складаныя заданні ні былі, пры правільна пастаўленай і добрасумленнай падрыхтоўцы станоўчы вынік будзе дасягнуты абавязкова.

Калі ж пайсці па шляху спрашчэння тэставых заданняў, то ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў, без сумнення, знізіцца. Адбудзецца выраўноўванне слабых, сярэдніх і моцных абітурыентаў. Аднак больш падрыхтаваныя ўсё роўна атрымаюць больш высокія вынікі. Гэта натуральна. У такім разе ўзнікае цалкам заканамернае пытанне, а які сэнс зніжаць ступень складанасці заданняў ЦТ? Толькі для таго, каб менш падрыхтаваныя абітурыенты набралі на некалькі балаў больш, чым пры цяперашняй сістэме? Але ж яны ўсё роўна застануцца на тых жа другасных пазіцыях. У выніку мы атрымаем больш нізкі ўзровень ЦТ, адпаведна, і падрыхтоўка абітурыентаў не палепшыцца, а хутчэй, наадварот. Тады які сэнс праводзіць ЦТ? Галоўная задача яго заключаецца не толькі ў тым, каб пазбегнуць неаб'ектыўнасці пры паступленні, але і ў тым, каб абітурыенты былі добра падрыхтаванымі, мелі трывалыя веды, змаглі годна вытрымаць конкурс і ўпэўнена пачаць вучобу ў абранай ВНУ. Каб дагадзіць слаба падрыхтаваным абітурыентам, нам не варта адступаць ад існуючай сістэмы ЦТ, бо гэта будзе крок назад, чаго нельга дапусціць. Так, у любым выпадку сістэма цэнтралізаванага тэсціравання павінна ўдасканальвацца, але толькі не ў бок зніжэння ўзроўню тэставых заданняў. Магчыма, па нейкіх прадметах частку заданняў мае сэнс пераглядзець, зрабіць іх больш даступнымі і зразумелымі для ўдзельнікаў тэставых выпрабаванняў. Але ў цэлым цэнтралізаванае тэсціраванне павінна быць зарыентавана на моцных і добра падрыхтаваных абітурыентаў. Толькі ў гэтым выпадку яно мае права на жыццё, і толькі ў гэтым выпадку ўзровень падрыхтоўкі абітурыентаў і студэнтаў будзе расці, а гэта ў інтарэсах усяго нашага грамадства.

**Аляксандр МОХАРАЎ, выкладчык гімназіі бізнэсу і права № 51 г. Гомеля.**



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Муз-news**

## ПАМІЖ ЧУКАМ І ГЕКАМ



**У клубе «Міленіум» 6 верасня (пачатак а 23 гадзіне) Вольга Драздова прадставіць свой новы кліп на песню «Вечар у До-мінор». На вечарынку завітаюць Аляксандр Саладуха, Алена Грышанава, Аляксей Хлястоў, «Чук і Гек» і іншыя.**

Здымаўся кліп у Кіеве. Аператарам быў Вячаслаў Пілунскі, вядомы па працы над ролікамі Алы Пугачовай, Валерыя Меладзе, «Віа Гры».

— Песня «Вечар у До-мінор» — гэта гісторыя кахання, у якой расказваецца аб класічным любоўным трохкутніку, — расказвае Вольга Драздова. — Па сюжэту я знаходжуся побач з адным мужчынам, а мару аб сустрэчы з іншым. Дарэчы, іх ролі выканалі Дзіма і Паша з гурта «Чук і Гек». Запрасіла я іх, бо мы даўно сябруем. Акрамя таго Дзіма (Гек) — адзін з аўтараў песні «Вечар у До-мінор».

## САЛАДУХА ЗАПАЛІЦЬ «АЛІМПІЙСКІ ФАКЕЛ»



**З нагоды 20-гадовага юбілею сваёй творчай дзейнасці Аляксандр Саладуха прэзентуе 20 верасня а 20 гадзіне на сцэне Віцебскага Летняга амфітэатра сольны канцэрт «Сотні кіламетраў да кахання». Ён стане 100-м у рамках тура па гарадах Беларусі.**

Цікава, што рашэнне выступіць на адной з самых вялікіх адкрытых пляцовак нашай краіны (умяшчальнасць амфітэатра 6200) спявак параўнаў з удзелам у Алімпійскіх гульнях:

— Алімпіяда праходзіць раз у чатыры гады, а ў мяне 4 гады таму была напісана песня «Сотні кіламетраў да кахання», — нагадаў Аляксандр. — Дарэчы, калі ў мяне з'явілася параўнанне з Гульнямі, я падумаў, што варта было б запаліць на сцэне нейкі сімвал накшталт алімпійскага факела. Магчыма, ім стане ліхтар.

Гледачы пачуюць таксама голас Вольгі Драздовай, якая выконвае песню «Сотні кіламетраў да кахання» ў дуэце з Саладухай. Сваё шоў падрыхтавалі і сыны-блізняты Аляксандра Саладухі — Аляксандр і Антон, якія паўтара года таму арганізавалі гурт «Элемент». Паралельна з падрыхтоўкай да канцэрта спявак заняты будаўніцтвам дома пад Мінскам.

## АКУНУЦЦА Ў «ПЕСНІ МОРА»



Беларуская спявачка Алена Валошына, удзельніца праекта «Гукі школ», заняла трэцяе месца на міжнародным фестывалі «Песні мора-2007», які з 25 па 28 жніўня праводзіўся ў Севастопалі. У фінале выступалі прадстаўнікі шасці краін — Украіны, Грузіі, Малдовы, Расіі, Ізраіля і Беларусі. Узрост удзельнікаў быў ад 18 да 35 гадоў. Узначальваў журы, якое ацэньвала майстэрства канкурсантаў, народны артыст Украіны Ян Табачнік. Поспех нашай зямлячцы прынесла песня «Call me», музыку да якой напісаў Сяргей Ждановіч. Дарэчы, аснову рэпертуару Алены Валошынай складаюць менавіта англамоўныя песні.

— Я хацела паспрабаваць свае сілы, — прызналася Лена. — Акрамя таго, конкурс «Песні мора» праходзіць у рамках музычнага фестывалю «Зорны бераг», які кожны год збірае вялікую колькасць вядомых выканаўцаў, а новыя знаёмствы — заўжды карысна. Конкурс транслюецца па ўкраінскаму тэлебачанню, а гэта — добрая магчымасць «засвяціцца».

## МАНЖУРА ДАПАМОЖА ЎСТАНАВІЦЬ СУСВЕТНЫ РЭКОРД?

Восенню праект M'ANZHURA прадстане ў новым выглядзе (нядаўна выканаўца Дзіма Манжура запрасіў бэк-вакалістак-мадэляў Жэню і Дашу). На гэты ж час запланавана прэм'ера новай пласцінкі і шоў-праграмы. У перапынках паміж запісамі песень, рэпетыцыямі і здымкамі відэа на песню «Каханне-шкло» музыканты паспяваюць адпачываць, а часам з імі здараюцца нечаканыя прыгоды. Напрыклад, Дзіму занесла ў Кіеве на пірсінг-вечарынку, дзе яго выклікалі на сцэну і... прабілі брыво. Калі такім чынам пірсінг увайшоў у яго жыццё, Манжура змірыўся з гэтым і нават адправіцца 15 верасня ў сталіцу Украіны на ўстанаўленне сусветнага рэкорду па колькасці праколаў для кнігі Гінеса.

**Ірына АНАТАВА.**

**ПлацдАрм**

# АРМЕЙСКАЯ «ЗОРКА»

Папулярны ва Узброеных Сілах фестываль салдацкай песні крыху зменіць свае правілы, а дакладней — пашырыць спіс удзельнікаў. Зараз у ім могуць выступаць не толькі творчыя калектывы і выканаўцы з ліку ваеннаслужачых, грамадзянскага персаналу Узброеных Сіл і членаў іх сем'яў, але і ўсе жадаючыя, калі яны з'яўляюцца грамадзянамі Рэспублікі Беларусь. Для ўдзелу ў конкурсе да 1 кастрычніка патрэбна падаць заяву ў раённы камісарыят па месцу жыхарства.

У Міністэрстве абароны таксама было прынята рашэнне перайменаваць конкурс. Зараз гэта тэлевізійны фестываль армейскай песні «Зорка». Аднак жывы вакал і галоўная тэматыка рэпертуару — ваеннапатрыятычная — захоўваюцца: песні могуць быць аб вернасці салдата свайму абавязку, радзіме, аб подзвігу і г.д. Фестываль будзе праходзіць у тры этапы. Фінал пройдзе ў Цэнтральным доме афіцэраў. Выступленні будуць паказаны на Першым канале да Дня абаронцаў Айчыны. Журы назаве самых таленавітых у намінацыях: «Выканаўцы песень прафесійных аўтараў», «Вакальныя групы і ансамблі», «Аўтары-выканаўцы», «Выканаўцы армейскай песні».

**Ірына ПРЫМАК.**

**Працяг тэмы**

# ЗЯЛЁНАЯ РУНЬ

## На ўсё жыццё ўдзячны педагогам

**У юбілейным нумары «Звязды» (9 жніўня г.г.) у рубрыцы «Гісторыя — з канверта» быў апублікаваны матэрыял «Агітплакат, выпушчаны «Звяздой», наш чытач Аляксей Пухавой захоўвае ўсё жыццё».**

**Нагадаем: Аляксей Лявонцьевіч Пухавой з г. Беразіно Мінскай вобласці даслаў у рэдакцыю ўнікальны дакумент — 12 нумар сатырычнага агітплаката «Раздавім фашысцкую гадзіну», які выдавала «Звязда» з ліпеня 1941 года. Зараз гэта ганаровы экспанат музея «Звязды»...**

**Як нам удалося высветліць у час падрыхтоўкі публікацыі, сам Аляксей Лявонцьевіч — інвалід Вялікай Айчыннай вайны, былы партызан і франтавік, удзельнік штурму Кёнігсберга. Ён узнагароджаны ордэнамі Славы III ступені, Айчыннай вайны I ступені, двума медалямі «За адвагу», іншымі баявымі і працоўнымі ўзнагародамі.**

**Усе пяць братоў Пухавых — Аляксей, Анатоль, Рыгор, Уладзімір і Міхаіл — удзельнічалі ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Трое з іх — у складзе партызанскага атрада «Перамога» брыгады імя Шчорса, якая дзейнічала ў Барысаўскім, Бярэзінскім і Чэрвеньскім раёнах.**

**Аляксей Лявонцьевіч Пухавой напісаў дакументальную аповесць «Зялёная рунь» — пра хлопцаў і дзяўчат, якія зусім юнымі («зялёнымі») сустрэлі вайну. Многія з іх сталі падпольшчыкамі і партызанамі, змагаліся за Перамогу...**

**Як і абяцалі, друкуем урывак з аповесці.**

**Аляксей ПУХАВОЙ.**

Родам я з вёскі Вяляцічы, што на Барысаўшчыне. Калі азіраюся на маленства, прыгадваю сваіх бацькоў і братоў ды родную школу, яе дырэктара, настаўнікаў. У мясцовай школе былі багатыя традыцыі, бо яшчэ ў 1935 годзе, калі я хадзіў у трэці клас, ёй споўнілася 90 гадоў.

У школе працавалі цудоўныя педагогі. Вялікім аўтарытэтам карыстаўся яе дырэктар Георгій Сямёнавіч Шыёнак. Першай маёй настаўніцай была Алена Іванаўна Анікевіч. А як любілі вучні Аляксея Аляксандравіча Шкутава! У час вайны ён стаў камісарам, а затым камандзірам партызанскага атрада «Камуніст» брыгады імя Шчорса.

Наша сям'я жыла бедна. Хадзіў я ў школу ў саматканым адзенні, у лапцях. У 1937 годзе групу лепшых вучняў адправілі на экскурсію ў Мінск. Дык школа купіла мне чаравікі для гэтай паездкі.

...22 чэрвеня 1941 года па вёсцы пранеслася: пачалася вайна з Германіяй.

### Крывавы «новы парадак»

... Мужчыны-ваеннаабавязаныя рушылі калонамі ў Крупкі. А што рабіць нам, старшакласнікам? Гэтае пытанне не давала спакою мне і маім сябрам Сяргею Кудзіну, Сяргею Паўлаўцу, Сяргею Стральцу. Вырашылі запасціся прадуктамі харчавання, адзеннем — каб потым, калі спатрэбіцца, пайсці ў лес, зрабіць сярод балота які будан, а там будзе відаць...

Чысла 28 чэрвеня была ўзарвана плаціна цераз раку Начу. З магазінаў парасцягвалі ўсе тавары; стаялі незамкнутыя, без гаспадароў, клуб, сельсавет, хата-чытальня.

...З прыходам акупантаў з'явіліся і здраднікі. Яны дапамагалі гітлераўцам усталёўваць «новы парадак». У першыя ж дні акупацыі сагналі вяскоўцаў на сход. Некаторых выклікалі па спецыяльных павестках. Аказалася, немцы ўжо ведаюць прозвішчы камуністаў і іншых актывістаў: пастараліся выслужыцца перад новай уладай здраднікі. На сходзе выступалі і гітлераўцы, і іх памагатыя. Было сказана, што «ўсіх камуністаў забралі ў рабочы лагер. Устанаўліваем новую ўладу, уладу без бальшавікоў». Затым усіх 16 камуністаў расстралялі. Вось такі «парадак» — крывавы тэрор — прынеслі нам фашысты. Гэта трагедыя ўскалыхнула вяскоўцаў.

### Як іскры ў цемры

... Я падтрымліваў сувязь, выконваў даручэнні свайго аднавяскоўца, афіцэра Чырвонай Арміі Кірыла Мікітавіча Касцюковіча, а таксама разведчыка атрада «Перамога» Міхаіла Клімчыка.

...У пачатку вясны 1942 года народныя мсціўцы актывізавалі сваю дзейнасць. У красавіку была разгромлена Вяляціцкая валасная ўправа, разбураны зборны малочны пункт. Насельніцтва стала больш актыўна супрацоўнічаць з партызанамі.

30 красавіка 1942 года ў лесе каля Мігоўшчыны высадзіўся дэсант з 12-ці дзяўчат-разведчыц на чале з Аленай Колесавай. На вялікі жаль, пры пасадцы трое з іх разбіліся, а дзвюх затрымалі выдрыцкія паліцаі і адправілі ў гестапа. Нават смерць гэтых патрыётак несла эмацыянальны зарад. Людзі казалі: «Калі ўжо такія юныя дзяўчаты ўзяліся за зброю, то наш народ непераможны. І нам сорамна сядзець і нічога не рабіць». А які гэта быў прыклад для юнакоў!

... У канцы 1942—пачатку 1943 года партызанскі рух набыў масавы характар. Акупанты і паліцаі не ведалі спакою ні днём ні ноччу. Тады яны пачалі праводзіць карныя экспедыцыі. У лістападзе 1942 года спалілі вёску Мігоўшчына, 14 кастрычніка — вёску Маталыга. У гэтай вёсцы згарэў і мой дзядзька Яфім Паўлавец разам са сваёй сям'ёй (5 чалавек), згарэлі многія яго аднавяскоўцы.

### У партызанскім атрадзе

Пра мае сувязі з партызанамі «разнюхалі» паліцаі. Дужа цікаваў за нашай сям'ёй сусед Васіль Хмялеўскі, даваенны член сельсавета, які з прыходам фашыстаў стаў іх памагатым. Тады я і мае браты Анатоль і Рыгор і сталі байцамі партызанскага атрада «Перамога».

Састарэлыя маці і бацька хаваліся ў сваякоў. Аднак восенню 1943 года іх высачылі, арыштавалі і адправілі ў Крупкі. У час начлегу ў вёсцы Нача ім удалося збегчы. Да канца вайны яны паасобку хаваліся ў сваякоў у розных вёсках. Уся гаспадарка была разбурана, разрабавана.

А мы, тры браты, ваявалі ў гэты час у складзе атрада «Перамога». Удзельнічалі ў разгроме нямецкіх гарнізонаў, хадзілі ў засады, знішчалі тэхніку і жывую сілу ворага, псавалі чыгунку, пускалі пад адхон варожыя эшалоны. Было ўсяго. Даводзілася ў марозныя зімовыя дні начаваць у будане з голля, правальвацца ў балотную дрыгву мокрай шэрай восенню, падоўгу галадаць...

Ды перамога і свабода вартыя ўсіх гэтых нягод, нязручнасцяў і пакут.

На рахунку нашага атрада і брыгады было шмат баявых аперацый. Адна з самых удалых — разгром нямецкага гарнізона ў вёсцы Восава Бярэзінскага раёна ў маі 1944 года. Гэты гарнізон ахоўваў абарончую лінію на рацэ Бярэзіна... А гэта між іншым быў «моцны арэшак». Яго тэрыторыя была абнесена калючым дротам, падыходы замініраваны, а дзоты, здавалася, не даюць аніякіх шанцаў узяць гарнізон. І ўсё ж мы «арэшак» раскалолі!..

### «Рэйкавая вайна»

Прыкладна з 14 чэрвеня 1944 года наш атрад правёў удалую «вылазку» на чыгунку ля паўстанка «Барсукі». Загадзя была праведзена вучоба ўдзельнікаў аперацыі, абгавораны непрадбачаныя сітуацыі, кожны дэталёва ведаў сваю задачу...

Падобныя аперацыі правялі адначасова ўсе атрады нашай брыгады. У гэту ноч была разбурана ці пашкоджана чыгунка ад Оршы да Маладзечна.

29 чэрвеня брыгада імя Шчорса (камандзір Дзяруга, камісар Прусак) атрымала радыёграму, у якой Беларускі штаб партызанскага руху патрабаваў узмацніць удары па праціўніку. Выконваючы гэты загад, усе шэсць атрадаў колькасцю 1885 чалавек 30 чэрвеня выйшлі на шашу і іншыя дарогі і ўступілі ў бой з немцамі, захапілі ў палон больш як 300 салдат і 18 афіцэраў. Шмат гітлераўцаў было забіта.

1 ліпеня немцы тройчы спрабавалі прарвацца на Смалявічы цераз партызанскую зону ў вёсцы Слабада, але панеслі вялікія страты і не змаглі выканаць пастаўленую задачу.

2 ліпеня раніцай у зоне дзеяння нашай брыгады з'явіліся танкі 2-га гвардзейскага Тацінскага танкавага корпуса. Партызаны сталі для танкістаў праваднікамі.

### Парад у вызваленай сталіцы

Пасля знішчэння разрозненых груп гітлераўцаў мы атрымалі каманду рухацца ў Мінск. Па былой ваеннай дарозе цераз Волму прыбылі ў Сцяпянку і спыніліся.

А 16 ліпеня 1944 года адбыўся партызанскі парад у вызваленай ад ворага сталіцы Беларусі.

Раніцай байцы нашага атрада са зброяй у руках выстраіліся ў калону і па вуліцах разбуранага Мінска рушылі да месца. Многія вуліцы былі завалены, горад ляжаў у руінах. Шматлікія атрады партызан сабраліся на лузе каля ракі Свіслач. Апрануты яны былі ў рознае адзенне, часта — у трафейную форму. У руках — розныя віды зброі. Затое на галаўных уборах усіх партызан былі наўскос прышыты чырвоныя стужкі, на некаторых фуражках паблісквалі ў промнях сонца чырвоныя зорачкі.



**Аляксей Пухавой.**

На трыбуне — урад рэспублікі і военачальнікі. Пасля мітынгу партызаны праходзілі каля трыбуны, і кіраўніцтва вітала іх. Наперадзе калоны правялі казла з навешанымі на шыю нямецкімі крыжамі і рэгаліямі.

На наступны дзень нам выдалі даведкі. Мы ў камандзіра нашай роты Позырава прасілі, каб нас хоць на дзень адпусцілі дадому пабачыцца з сем'ямі. Ён абяцаў, аднак атрымалася інакш.

### На захад!

...22 ліпеня чыгункай накіраваліся на фронт. Цікавы факт: на адной са станцый наш эшалон чамусьці доўга стаяў, «разведчыкі» з суседняга вагона паспелі знайсці цыстэрну са спіртам, усе пачалі насіць спірт хто ў чым мог. У вагонах пачалася п'янка. Начальства ўзялося шукаць вінаватых, а п'яныя — усе. Тады хуценька далі нашаму эшалону «зялёнае святло», і мы ў вясёлым настроі паехалі далей на захад.

... Малодшы брат Рыгор, 1926 года нараджэння, быў залічаны ў 53-ю мотамеханізаваную брыгаду аўтаматчыкаў. Старэйшы брат Анатоль трапіў у батарэю 82-міліметровага мінамёта, а я — у дэсантную роту аўтаматчыкаў 32-й танкавай брыгады. Так мы аказаліся ў розных часцях 5-й танкавай арміі, ну а самыя старэйшыя нашы браты — Уладзімір і Міхаіл — ваявалі на іншых франтах.

У дэсантную роту разам са мной былі залічаны Сяргей Кушнер з Барысаўшчыны і Шупа з Ушанскага сельсавета Бярэзінскага раёна.

Атрымаў я аўтамат, плашч-палатку, кацялок, біклагу, уручылі мне чырвонаармейскую кніжку і размеркавалі да танка Т-34. Прыбыў я на месца прызначэння, сеў ля танка ды бацькоў сваіх успомніў. Дзе яны, што з імі, мы, іх сыны, не ведалі. Дужа маркотна было, што не пабачыліся перад адпраўкай на фронт. Можа, было ў душы нейкае прадчуванне, што ўсе разам мы ўжо не зможам сабрацца. Так і здарылася. 26 студзеня 1945 года ва Усходняй Прусіі загінуў Рыгор, яшчэ раней, у 1944 годзе, на тэрыторыі Польшчы склаў сваю галаву Уладзімір.

Пяцёра сыноў выгадавалі нашы бацькі, дадому з фронту вярнуліся трое: Міхаіл, Анатоль і я.

Лёс нашай сям'і — не выключэнне. Перамога над ворагам заваявана вялікай цаною. На яе алтар паклалі свае жыцці мільёны савецкіх людзей, многія з якіх былі зусім маладымі. Вечная ім памяць і ўдзячнасць!



**Магіла брата Рыгора на вайсковых могілках г. Эльблонг.**

### Ад рэдакцыі.

***Доўгі час Аляксей Пухавой расшукваў загінулых братоў. Уладзімір прапаў без вестак у складзе войскаў, якія наступалі на Варшаву. Рыгор загінуў 24 студзеня 1945 года ва Усходняй Прусіі. Дзякуючы Чырвонаму Крыжу Беларусі, атрымаў фотаздымак яго магілы на вайсковых могілках горада Эльблонг (Польшча)... «Магчыма, сярод сталых чытачоў «Звязды» ёсць і тыя, хто ваяваў ва Усходняй Прусіі і быў відавочцам гібелі майго брата Рыгора? Буду ўдзячны, калі хто адгукнецца...».***

# НАПЯРЭДАДНІ ПЕРШАГА ЗВАНКА

**«Мой родны кут, як ты мне мілы» — менавіта гэтыя радкі славутага беларускага песняра стануць эпіграфам першага ўрока, які пройдзе ў беларускіх школах у Дзень ведаў. Школьны званок, які абвесціць пачатак навучальнага года, прагучыць 1 верасня для 1 млн 150 тыс. беларускіх школьнікаў, у тым ліку і для 92,4 тыс. першакласнікаў.**

Сёлета Дзень ведаў папярэднічае Дню беларускага пісьменства, які пройдзе 2 верасня ў Шклове. А 1 верасня ў школьныя класы Шклова прыйдуць беларускія пісьменнікі, кнігавыдаўцы і славутыя людзі. Такім чынам будзе дадзены старт усім іншым святочным мерапрыемствам Дня беларускага пісьменства. У год святкавання 125-годдзя з дня нараджэння народных паэтаў Беларусі Янкі Купалы і Якуба Коласа Міністэрства адукацыі рэкамендавала педагогам правесці паэтычныя чытанні і конкурсы, кніжныя выставы і фестывалі паэзіі, а таксама экскурсіі ў Дом-музей Янкі Купалы, Літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа і Мемарыяльны музей-сядзібу Акінчыцы на радзіму знакамітага паэта.

1 верасня навучэнцаў 11-класаў чакае падарунак — для іх упершыню падрыхтаваны навучальны дапаможнік «Беларусь — краіна тваёй будучыні». Над кнігай працавалі вядомыя беларускія навукоўцы, грамадскія дзеячы, спецыялісты міністэрстваў, педагогі ВНУ, ССНУ і прафтэхустаноў, а таксама спецыялісты выдавецтва «Пачатковая школа». Да таго ж да дапаможніка прыкладаецца кампакт-дыск, на якім прадстаўлены асноўныя нарматыўныя дакументы, якія датычаць выпускнікоў і абітурыентаў, а таксама каментарыі да іх спецыялістаў. Акрамя таго, выпускнікі змогуць знайсці на дыску карту з пералікам вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў і доўгатэрміновыя правілы прыёму.

Новыя навучальныя дапаможнікі атрымаюць і трэцякласнікі: па беларускай і рускай мовах, літаратурным чытанні, матэматыцы, працоўным навучанні і «Асновах бяспекі жыццядзейнасці». Для вучняў чацвёртых класаў падрыхтаваны новыя навучальныя дапаможнікі па курсу «Мая Радзіма — Беларусь» і па замежных мовах. А навучальны дапаможнік «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» для сямікласнікаў увогуле ствараўся «ударнымі» тэмпамі, што тлумачыцца ўвядзеннем новых адукацыйных стандартаў і праграм. Улічваючы важнасць гэтага курса ў фарміраванні асобы, было вырашана павялічыць час на яго вывучэнне: калі у 11-гадовай школе курс «Чалавек. Грамадства. Дзяржава» вывучаўся, пачынаючы з 8 класа на працягу чатырох гадоў, то ў 12-гадовай школе ён будзе выкладацца на працягу шасці гадоў (з 7 па 12 класы).

У параўнанні з папярэднім навучальным годам колькасць пачатковых, базавых і сярэдніх школ скарацілася ў краіне больш чым на 100 адзінак. Яшчэ 148 устаноў былі рэарганізаваны — у гімназіі, вучэбна-педагагічныя комплексы «дзіцячы сад-школа», «дзіцячы сад—пачатковая школа» і інш. Новы статус гімназіі набудуць 22 сярэднія агульнаадукацыйныя школы. Прычым 15 новых гімназій адкрыюцца ў сельскай мясцовасці.

На Гомельшчыне ў новым гімназічным статусе сустрэнуць сваіх навучэнцаў 8 школ: тры гімназіі адкрыюцца ў Гомелі, тры — у райцэнтрах (Веткаўская, Петрыкаўская і Чачэрская) плюс гімназіі ў вёсках Брылёва Гомельскага і Азарычы Калінкавіцкага раёнаў. Сем навучальных устаноў новага тыпу пачнуць працаваць і ў Гродзенскай вобласці — практычна ўсе яны разлічаны на вясковых дзяцей. Напрыклад, у Навагрудку на базе школы-інтэрната створана гімназія-школа-інтэрнат для адораных дзяцей з сельскай мясцовасці.

На сённяшні дзень рознымі формамі і відамі дыферэнцыраванага навучання ахоплена каля 50 працэнтаў беларускіх школьнікаў. Класы з паглыбленым вывучэннем асобных прадметаў адкрыты ў 1600 агульнаадукацыйных установах. У 90 навучальных установах замежныя мовы вывучаюцца на паглыбленым узроўні, а профільныя класы маюць 2400 агульнаадукацыйных устаноў. Як сведчыць практыка, найбольш запатрабаванымі ў старшакласнікаў з'яўляюцца класы фізіка-матэматычнага (20,3 працэнта), філалагічнага (16,4 працэнта), тэхналагічнага (15,3 працэнта), хіміка-біялагічнага (9,5 працэнта) і эканамічнага (4,7 працэнта) профіляў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

КОЛАЙ
раскрытых душ і дзвярэй

# «А МНЕ ТУТ РАЙСТВА!»

## КУДЫ ВЫРВАЦЦА З «КАМЕННЫХ ДЖУНГЛЯЎ»?

**На вёсцы цяпер сапраўды багатая пара — жніво завершана, але ў садах і на агародзе шмат чаго яшчэ збіраць засталося. У паветры ўжо лунае восень, надвор'е стала пераменлівае, як жаночы нораў. У адзін з такіх залатых дзянькоў адкрыў для сябе дзівосныя мясціны, дзе хоць на некалькі гадзін удалося адпачыць душой ад шалёнага, вар'яцкага горада. Адным словам, трапіў у Слабаду.**

**КРОПКА НА... ГЛОБУСЕ**

Увогуле ў Смалявіцкім раёне ёсць некалькі населеных пунктаў, якія называюцца Слабада. Ёсць такі прыпынак і на чыгуначнай ветцы. Таму, каб адшукаць неабходны маршрут, давялося прасіць дапамогі. На «шлях сапраўдны» вывеў намеснік кіраўніка сельскагаспадарчага падраздзялення «Першамайскі» Мікалай Мароз. Па дарозе ён і растлумачыў усе асаблівасці мясцовай картаграфіі — пасля такой змястоўнай «лекцыі» ўсё, здавалася б, стала на свае месцы, але, як аказалася пазней, пара здзіўленняў толькі пачыналася.

Гаспадарка, у якую завітаў, мае амаль 80-гадовую гісторыю — у 1929-м тут быў створаны калгас «Колас». Праз нейкі час сельгаспрадпрыемства атрымала назву «1 мая». Гэтая «шыльда» (з пэўнымі карэктывамі) захавалася і дасюль. Сёлета гаспадарка стала адасобленым структурным падраздзяленнем Беларускага аўтамабільнага завода. Вось, напэўна, асноўныя вехі «працоўнай біяграфіі». Сельгаспрадпрыемства мае амаль «стандартныя» памеры — плошча палеткаў складае каля 4 тыс. гектараў. Такія базавыя ўмовы, якія мелі і маюць большасць айчынных гаспадарак.

Зразумела, выйсці на перадавыя пазіцыі было вельмі няпроста. Аднак гэта ўдалося зрабіць: калі напрыканцы 1990-х гадоў ураджайнасць збожжавых складала 13,3 цэнтнера з гектара, то сёлета — 47,2. Дарэчы, гэта лепшы паказчык у раёне, і такія пазіцыі гаспадарка трымае не адзін год. Збожжа патрэбна для таго, каб забяспечыць якаснымі кармамі немаленькае пагалоўе: больш чым 2,2 тыс. буйной рагатай жывёлы (малочны статак — 610 кароў) і 4,2 тыс. свіней. Працуе ўласны камбікормавы цэх, таксама тут жа, на месцы, перапрацоўваецца жывёлагадоўчая прадукцыя.

Паводле слоў Мікалая Мароза, у «мясным» цэху вырабляецца каля 25 найменняў смачнага тавару, малочны пакуль выпускае толькі пастэрызаванае малако ў літровых пакетах. Праўда, у планах — вырабляць яшчэ тварог, смятану і кефір. Ужо цяпер у «Першамайскім» замкнёны цыкл вытворчасці, які ў тым ліку ўключае і гандлёвую сетку (праўда, невялікую — некалькі «кропак»). А таксама гарантаваны збыт пэўных аб'ёмаў прадукцыі — забяспечваецца патрэба шматтысячнага калектыву БелАЗа (тым больш, што гаспадарка стала адным са структурных падраздзяленняў вядомага прадпрыемства). Здавалася б, у такіх умовах можна «супакоіцца». Аднак «Першамайскі» тым і вылучаецца нават сярод моцных сельгаспрадпрыемстваў (якім, несумненна з'яўляецца), што тут заўсёды думаюць на некалькі крокаў наперад. Мабыць таму на агульным «фоне»спачатку і застаюцца незразумелымі (непачутымі?) дзівакамі. Аднак самыя смелыя, амбіцыйныя планы спраўджваюцца. І вялікі глобус (сабраны са звычайных запчастак і металічных канструкцый) каля калгаснай канторы ўжо не падаецца нечым незвычайным.

**«БЭБІ-БУМ» ПА-СЛАБОДСКІ**

Як лічаць у «Першамайскім», патрэбная альтэрнатыўная занятасць людзей. Да гэтага вымушае інтэнсіфікацыя сельскагаспадарчай вытворчасці — прасцей кажучы, сучасная тэхніка патрабуе менш работнікаў, таму рынак працы з кожным годам змяншаецца. Найбольш перспектыўным тут з'яўляецца развіццё сферы паслуг, чым уласна ў «Першамайскім» і займаюцца апошнія некалькі гадоў. Пазалетась тутэйшыя мясціны сталі адной з прывабных кропак на турыстычных маршрутах. Уся неабходная інфраструктура для належнага прыёму гасцей узводзілася адначасова — работы вяліся адразу на некалькіх аб'ектах. На базе гаспадаркі быў створаны агратурыстычны комплекс «Выгода». Тут зараз працуюць 27 чалавек, гэта новыя рабочыя месцы.



Гаспадыня «Гасцёўні па-слабодску» Таццяна ЯСКО.

У сферы агра- і экатурызму — шмат моладзі. Віялета Кулакоўская — начальнік аб'екта «Паляўнічы закуток». Кажа, што раней працавала прадаўцом у мясцовай краме, пасля была ў адпачынку па догляду за дзіцем. Як выйшла, то ёй адразу прапанавалі асвойваць новае. Да гэтай дзейнасці, дарэчы, мясцічы спачатку ставіліся з вялікім недаверам: маўляў, навошта нешта выдумляць. А вось Віялета Уладзіміраўна адразу паверыла ў перспектыву «вясковага» турызму — мясціны прыгожыя, варта толькі іх належным чынам падаць, да таго ж літаральна «пад бокам» сталіца. Так і пачала працаваць, «захварэла» гэтай справай. Але ж трэба набываць адукацыю — зараз Кулакоўская перайшла на чацвёрты курс Міжнароднага інстытута сацыяльных адносінаў, дзе займаецца па спецыяльнасці «эканаміст-менеджар».

Дарэчы, уся тутэйшая моладзь стараецца вучыцца, галоўнае — уласнае жаданне, а гаспадарка заўсёды падтрымае. Будучае многія звязваюць менавіта з роднымі мясцінамі, паколькі з'явілася перспектыва. Слабада апошнім часам набыла зусім іншы выгляд: зроблены дыхтоўныя дарогі, узводзіцца жыллё. Як заўважыла Віялета Кулакоўская, раней у вёсцы быў асобны куток з пабудовамі барачнага тыпу, які ўсе «шанхаем» называлі. Цяпер старое жыллё паступова зносіцца, і людзям выдзяляюць сучасныя катэджы з усімі гарадскімі выгодамі. Такія перавагі ўсе ацанілі належным чынам — у сталіцу ніхто асабліва і не рвецца. «Калі прапануеце пераехаць, — нізавошта не пагаджуся, — упэўнена заўважае Віялета Уладзіміраўна. — А чаго мне там шукаць?»



Яніна Васільеўна КОПАЦЬ — з Зылеў.

У тутэйшых мясцінах апошнім часам сапраўдны «бэбі-бум», ёсць сем'і, дзе па тры, а то і па чатыры дзіцяці. У дзіцячым садку «пад завязку» заняты ўсе 56 месцаў, людзі загадзя пішуць адпаведную заяву і становяцца на чаргу. У Слабадзе працуе свая «Гасцёўня па-слабодску», дзе заўсёды можна паласавацца беларускімі нацыянальнымі стравамі — мачанкай, верашчакай, дранікамі і іншай смакатой. Як паведаміла дырэктар гэтага агра- экатурыстычнага комплексу Таццяна Яско, тут добра пад'есці можна за 4—4,5 тыс. рублёў. У меню і сапраўды «ўмоўныя» цэны: напрыклад, порцыя тушанай трусяціны каштуе ўсяго 2200 руб. Гатуюць тут вельмі смачна, «як дома», што належным чынам ацанілі шматлікія наведвальнікі.

Пабудаваны ў вёсцы фізкультурна-аздараўленчы комплекс, дзе ёсць усе ўмовы для здаровага адпачынку. Дзіцячыя секцыі бясплатныя, а пасля 17.00 прыходзяць займацца дарослыя. Настольны тэніс, більярд, веласіпеды, конныя прагулкі (працуе ўласны коннаспартыўны клуб), трэнажорная зала — занятак па душы можа знайсці кожны. Таму многія менавіта «на ФАКу» бавяць вольны час. У перспектыве ў Слабадзе плануецца пабудаваць маладзёжны сацыяльны гандлёва-бытавы цэнтр, а таксама ўласны гіпермаркет. Дык чаму ж не жыць?

**РЭЧКА ВОСТРАЎ НА ХУТАРЫ ЗЫЛІ**

Тут з павагай ставяцца да гісторыі, берагуць і аднаўляюць нацыянальныя традыцыі. Сапраўдны культурны цэнтр акругі — «Сялянская сядзіба», дзе створаны адметны дом рамёстваў. Хату стогадовага «ўзросту» адшукалі недзе на Смалявіччыне, перавезлі і клапатліва сабралі на новым месцы. Бярвенні крыху падчасалі, каб зрабіць больш светлымі, бо з цягам часу драўніна амаль пачарнела — сапраўдны колер можна ўбачыць па кутах, куды з сякерай не падступіцца. Дах з чароту, зёлкі, сапраўдная печ — дыхаецца ў старой хаце зусім па-іншаму, чым у горадзе, на самай справе адчуваеш, як вяртаешся да сваіх вытокаў. Святлана Андруховіч узначальвае гэты турыстычны аб'ект, жыве тут ужо год. Вырашыла збегчы сюды са сталіцы (з «каменных джунгляў», як яна кажа) і аб гэтым ніколькі не шкадуе. Наадварот — у вялікім захапленні. Прымае гасцей, а таксама энергічна ўдзельнічае ў развіцці «Сялянскай сядзібы». Ужо пачаў будавацца Дом чаяпіцця, у планах — узвядзенне Дома мёду, а таксама вялікага падворку, дзе будзе знаходзіцца ўся жывёла, якую трымаюць сяляне, мяркуецца туды «пасяліць» і страуса. На сядзібе ёсць уласны пчальнік, адзін з больш чым трох дзесяткаў вулляў «шкляны» — за жыццём вялікай пчалінай сям'і можна паназіраць, што называецца, на ўласныя вочы. Даведаўся пра больш чым дзесятак відаў мёду, кожны з якіх мае свае ўласцівасці. Вакол — проста мора кветак, і гэта толькі пачатак. Як казала Святлана Андруховіч, тут будзе свой батанічны сад, каб можна было з вясны да восені назіраць усе прыродныя колеры — ад ізумруднага да бардо. У маі пасадзілі свой сад, а таксама на шасці сотках вырошчваюць зёлкі.

Так тут раней жылі людзі, адсюль падчас калектывізацыі іх пачалі адсяляць — вось і «з'явілася» Слабада. Быў хутар Зылі, дзе ўсе жыхары мелі такое прозвішча — дванаццаць хат (сапраўды біблейская колькасць). Зараз гэта вёска Востраў. Раней тут цякла рачулка, якая пасля меліярацыі перасохла. З усіх Зылёў засталася адна 78-гадовая Яніна Васільеўна (па мужу Копаць). Доўгі час жыла на хутары адна, але ж нічога не баялася і не сумавала. Не было калі — трымала вялікую гаспадарку (свінні, козы) і завіхалася ад цямна да цямна на ўласным падворку. Ды і зараз, калі «збыла» ўсю жывёлу, не сядзіць на месцы — дапамагае калгаснаму пчаляру даглядаць пчол (якраз калі прыехаў, яны разам мёд адкатвалі). І новым суседзям, і шматлікім гасцям бабуля Яня заўсёды рада — адраджаюцца Зылі.

— У горад не хачу, — горача даказвае Васільеўна, — няма чаго мне там рабіць, а тут я заўсёды рухаюся, нешта раблю. Градкі даглядаю, курэй пакармлю, магчыма, хутка зноў казу вазьму. Усё сваё, роднае, знаёмае — мне тут райства...

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**
**Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.**
*Смалявіцкі раён.*

## Інфарм-укол

### НЕ МАРНУЕМ ЧАС

**Арганізаванасць — вось што дапамагае стаць паспяховым.**

Хранафагамі (у перакладзе — «пажыральнікамі часу») можа аказацца хто заўгодна. Але галоўныя хранафагі — гэта:

- Асабістая неарганізаванасць — нечаканыя тэлефонныя званкі, наведвальнікі і г.д. Чым больш вы дазваляеце адцягваць сваю ўвагу, тым больш гэта будуць рабіць. Гаварыце «не» розным умяшальніцтвам — рашуча, без лішніх тлумачэнняў, але ветліва.
- Запрашэнні і прапановы — нарады, семінары, мерапрыемствы, сустрэчы, на якіх у 80 працэнтах выпадкаў нічога не вырашаецца. Старайцеся часцей адпраўляць туды каго-небудзь замест сябе.
- Адтэрміноўкі. Мы падзяляем справы на любімыя і нелюбімыя. Першыя мы вырашаем адразу, а другія назапашваем. Карысна скласці спіс любімых, а таксама нелюбімых спраў, і кожную раніцу абавязкова рабіць мінімум адну нелюбімую — у такім выпадку на працягу дня мы будзем адчуваць прыемнае задавальненне ад выкананага абавязку.

Дарэчы, існуе цэлая галіна ведаў і навыкаў, якая так і называецца — тайм-менеджмент (ад англ. — «кіраванне часам»). На гэту тэму напісана шмат кніг і дапаможнікаў — шукайце іх у кніжных магазінах.

### ЗДЫМАЕМ АГРЭСІЮ

**Свет не мілы? Перастаньце гневацца на ўвесь свет, раяць іспанскія псіхолагі.**

- падыдзіце да люстэрка і зрабіце 20 баксіруючых рухаў;
- сагніце рукі ў локцях 20 разоў — «пакажыце мускулы»;
- вазьміцеся адной рукой за падбародак, а другую выцягніце наперад на 30 секунд, памяняйце рукі.

І злосць адступіць.

### НЕ СПІЦЦА — ПРАВЕРЦЕ ПЯЧОНКУ

Калі вы рэгулярна прачынаецеся паміж гадзінай і трыма ночы, верагодна, у вас ёсць праблемы з пячонкай. Паводле «ўнутранага хранометра», прынятага ў кітайскай медыцыне, гэты час — асноўны працоўны перыяд печані. Пры пашкоджанні «ачышчальных збудаванняў» шкодныя прадукты абмену рэчываў не атрымліваюць дастатковай фільтрацыі, што і абуджае таго, хто спіць.

### ЯДЗІМ І ТАНЦУЕМ

**Вы пераелі і вас мучыць сумленне? Уключыце музыку і патанцуйце.**

3 шакаладныя цукеркі запатрабуюць ад вас каля 20 хвілін року.

Порцыя паштэту — 30 хвілін танга.

6 крэветак — каля 10 хвілін лацінаамерыканскіх танцаў.

Кавалачак вэнджанай рыбы — 45 хвілін павольных танцаў.

Бакал шампанскага — 20 хвілін вальса.

Бутэрброд з ікрой — каля 10 хвілін шэйка.

Бутэрброд з мяснымі далікатэсамі — 2 гадзіны аэробікі.

### ГІПЕРТАНІЯ АД РАБОТЫ

**Заўсёды лічылася: чым больш чалавек працуе, тым вышэй у яго рызыка гіпертаніі. У Каліфарнійскім універсітэце даследавалі каля 25 тыс. офісных служачых і высвятлілі:**

— у тых, хто працуе больш за 40 гадзін у тыдзень, рызыка гіпертаніі на 14 працэнтаў вышэй, чым у тых, хто працуе 39 гадзін;

— пры нагрузцы ў 51 гадзіну ў тыдзень рызыка ўзрастае на 30 працэнтаў.

Але гэтыя лічбы павінны насцярожваць толькі тых, хто заняты некваліфікаванай працай. Складаная ж праца, якая патрабуе пастаяннага разумовага напружання, радзей прыводзіць да гіпертаніі.

### НЯМА СЭКСУ — НЯМА ЗЗЯННЯ

Французскія медыкі лічаць сэкс амаль ідэальным сродкам зняцця напружання, якое выклікана гармальнымі зменамі. Адсутнасць сэксу можа загубіць усё, «нажытае непасільнай працай», — добрую фігуру і ззяючую скуру.

Погляд

Надзея КАТКАВЕЦ:

## «Агракамбінат «Дзяржынскі» будзе рэарганізаваны ў буйнейшы сельскагаспадарчы холдынг краіны»

**Зараз у свеце актыўна ствараюцца буйныя аграпрамысловыя комплексы, якія маюць перавагу над іншымі вясковымі структурамі, бо яны сістэмныя, кампактныя, эканамічныя і эфектыўныя.**

Сёння на базе агракамбіната «Дзяржынскі» адпрацоўваецца мадэль стварэння буйнога сельскагаспадарчага прадпрыемства. На думку спецыялістаў, ААТ «Агракамбінат «Дзяржынскі» лічыцца адным з самых перспектыўных сельскагаспадарчых прадпрыемстваў краіны. Зараз тут працягваецца рэканструкцыя вытворчасці далучаных раней трох стратных гаспадарак Дзяржынскага раёна. Пасля аб'яднання агракамбінат за тры гады падвоіў выпуск прадукцыі мяса птушкі, а яго прыбытак за гэты час павялічыўся ў 6 разоў — з 5 млрд да 32 млрд рублёў. Сёння гаспадарка атрымлівае ў месяц каля 1 млн долараў прыбытку.

Зараз агракамбінат «Дзяржынскі» выпрабляе 24 тыс. тон мяса птушкі ў год. Каб атрымаць такую колькасць мяса, прадпрыемству трэба каля 50 тыс. тон збожжа, якое набываць сёлета за мяжой айчынным вытворцам эканамічна нявыгадна. Менавіта таму па рашэнню мясцовых уладаў і Мінаблвыканкама ў наступным годзе плануецца далучэнне да агракамбіната сельскагаспадарчых вытворчых кааператываў «Праўда-Агра», «Імя Фалько-2003», «Іскра-Агра» і «Кастрычніцкая рэвалюцыя».

Далучаныя тры гады таму да таварыства стратныя гаспадаркі ператварыліся ў прыбытковыя. Так, у былым калгасе «Пяцігор'е» заробкі вяскоўцаў павялічыліся з 130 тыс. да 1 млн 25 тыс. рублёў. Аб'ём вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі за гэты час павялічыўся ў тры разы, у 2,5—3 разы павысіліся паказчыкі па ўраджайнасці і малаку. Аднак сёння не ўсе запланаваныя да аб'яднання кааператывы згадзіліся працаваць у адной звязцы з моцным агракамбінатам. На агульным сходзе СВК «Кастрычніцкая рэвалюцыя» работнікі гэтага прадпрыемства вырашылі не аб'ядноўвацца ў новую структуру.

— Рэарганізоўваць сельскую гаспадарку шляхам далучэння слабых прадпрыемстваў да моцных з далейшай мадэрнізацыяй вытворчасці, — адзначыла журналістам першы намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Надзея Каткавец, — патрабуе ад нас само жыццё. Вяскоўцы дастойныя лепшага жыцця. Буйныя сельскагаспадарчыя холдынгі будуць ствараецца ў нашай краіне абавязкова. У гэтым наша будучыня.

— Разглядаючы апошнія падзеі, заўважу, што канфлікту тут, па сутнасці, няма, — патлумачыла сітуацыю намеснік міністра. — Гэта тэхнічны момант нашай працы. Зараз пачнём больш дасканала тлумачыць людзям перспектывы развіцця іх гаспадаркі. На мой погляд, работнікі СВК «Кастрычніцкая рэвалюцыя» з цягам часу самастойна разбяруцца ў сітуацыі і зробяць правільны выбар. Разам з тым, заўважу, што насільна далучаць ніхто нікога не збіраецца. Устаноўка ў нас зараз адна — адысці ад дзяржаўных субсідый у сельскую гаспадарку, накіроўваць дзяржаўныя грошы толькі на інвестыцыйныя праекты і інавацыйныя накірункі, — падкрэсліла Надзея Каткавец.

**Сяргей КУРКАЧ.**
*Мінск—Дзяржынскі раён.*

# Орда едзе ў Тураў

**Музыку Напалеона Орды будуць слухаць у Тураве. 2 верасня ў горадзе адбудзецца імпрэза камернай і духоўнай музыкі.**

Трэці раз яе арганізоўвае ў Тураве Нацыянальны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам прафесара Міхаіла Фінберга разам з Гомельскім аблвыканкамам і мясцовымі ўладамі. Гэты год у Беларусі праходзіць пад знакам таленту Напалеона Орды. Яго асоба натхняе на самыя розныя культурныя справы. Галоўнае, чаго чакаюць у Тураве, канешне, канцэрт «Ліра — маё прызванне», праграма якога была спецыяльна падрыхтавана аркестрам да 200-годдзя знакамітага беларуса, які дарагі нам сваёй кампазітарскай і мастацкай творчасцю. Камерныя калектывы аркестра дададуць уяўлення пра яго эпоху — іх выступленні прысвечаны музыцы сучаснікаў Орды.

Не проста выконваць музыку, але і вучыць на сваім прыкладзе дзяцей збіраюцца артысты. Напрыклад, заслужаны артыст Беларусі Генадзь Забара і ансамбль кларнетыстаў пад яго кіраўніцтвам правядуць майстар-клас для вучняў Жыткавіцкай школы мастацтваў.

Але славіць Напалеона Орду варта не толькі музыкай — ён у сваіх малюнках і акварэлях старанна захоўваў вобраз Беларусі, якую любіў. Гэтаму ў Тураве таксама будуць вучыцца дзеці — адкрыты ўрок малюнка ў Дзіцячай школе мастацтваў Турава правядзе народны мастак Беларусі Георгій Паплаўскі. Самадзейныя мастакі Жыткаўшчыны рыхтуюць сваю выставу ў гарадскім Доме культуры. Падтрымае землякоў народны хор Тураўскага гарадскога Дома культуры. Сустрэчы ў старажытным Тураве абяцаюць быць прыемнымі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

## Гульня № 1

### У ЗБОРНАЙ ЗАМЕНА

Абаронца расійскага «Растова» Сяргей Амельянчук не зможа ўзяць удзел у адборачным матчы Еўра-2008 з камандай Румыніі. У футбаліста выяўлена траўма паха. У хуткім парадку галоўны трэнер Бернд Штанге выклікаў на збор дапамогу з маладзёжнай зборнай — ігрока мінскага МТЗ-РІПО Ігара Мальцава. Спіс дэбютантаў «нацыяналкі» пашыраецца.

### БЕЛАРУСЫ ЗГУЛЯЮЦЬ У ЛІЗЕ ЧЭМПІЁНАЎ

Размова ідзе аб легіянерах, бо барысаўскі БАТЭ выбыў з барацьбы, уступіўшы ў Румыніі «Сціяуа» — 0:2. Каманда Ігара Крыўшэнкі стала першай з беларускіх дружын, якой удалося дайсці да трэцяга кваліфікацыйнага раўнда Лігі чэмпіёнаў. Дарэчы, футбалістам «Сціяуа» за перамогу над беларусамі паабяцалі 100 тыс. еўра прэміяльных.

У групавым турніры згуляюць два беларусы — Аляксандр Глеб і Валянцін Бялькевіч. Лонданскі «Арсенал» і кіеўскае «Дынама» з аднолькавым лікам (3:0) перамаглі сваіх сапернікаў у матчах у адказ. Кананіры — пражскую «Спарту» (першая сустрэча таксама завяршылася перамогай англічан — 2:0), а дынамаўцы — баснійскую «Сараева». Вынікі іншых паядынкаў (прапіснымі выдзелены ўдзельнікі групавога турніру ЛЧ): «ШАХЦЁР» (Украіна) — «Зальцбург» (Аўстрыя) — 3:1 (0:1), «СЕЛЦІК» (Шатландыя) — «Спартак» (Масква, Расія) — 1:1, па пенальці 4:3 (1:1); «БЕШЫКТАШ» (Турцыя) — «Цюрых» (Швейцарыя) — 2:0 (1:1), «СЛАВІЯ» (Чэхія) — «Аякс» (Галандыя) — 2:1 (1:0); «ЛІВЕРПУЛЬ» (Англія) — «Тулуза» (Францыя) — 4:0 (1:0); «РУСЕНБОРГ» (Нарвегія) — «Тамперэ» (Фінляндыя) — 2:0 (3:0), «Дынама» (Загрэб, Харватыя) — «ВЕРДЭР» (Германія) — 2:3 (1:2), «Андэрлехт» (Бельгія) — «ФЕНЕРБАХЧЭ» (Турцыя) — 0:2 (0:1), «Капенгаген» (Данія) — «БЕНФІКА» (Партугалія) — 0:1 (1:2), «Эльфсборг» (Швецыя) — «ВАЛЕНСІЯ» (Іспанія) — 1:2 (0:3), «Дынама» (Бухарэст, Румынія) — «ЛАЦЫО» (Італія) — 1:3 (1:1); «Црвена звезда» (Сербія) — «ГЛАЗГА РЭЙНДЖЭРС» (Шатландыя) — 0:0 (0:1).

Матч АЕК (Грэцыя) — «Севілья» (Іспанія) перанесены на 3 верасня з-за смерці 22-гадовага абаронцы іспанцаў Антоніа Пуэрта. Дарэчы, днямі 29 жніўня загінуў яшчэ адзін футбаліст: 26-гадовы нападаючы «Хапаэля» Часве Нсофва. Замбійскі легіянер зваліўся на полі ў час матча з землякамі з Макабі і памёр у бальніцы.

# ВАША СВЕТЛАСЦЬ — МАЯ МАГІЛЁЎШЧЫНА

**Звонкі вясновы дзень. Вестыбюль галоўнага корпуса Белдзяржуніверсітэта — нібы патрывожаны пчаліны вулей. Мы, будучыя журналісты, кучкуемся ў адным месцы. Смяёмся, жартуем, а на сэрцы ў кожнага трывога. Сёння — размеркаванне. Хтосьці даведаўся, што камісію па размеркаванню нас на працу ўзначальвае сам загадчык сектара друку ЦК КПБ Васіль Яфімавіч Цітавец. І вось мы ўжо ўзнімаемся на трэці паверх па ходжанай-пераходжанай за пяць гадоў вучобы галоўнай лесвіцы. Хтосьці запявае наш студэнцкі марш: «Друзья, вперед, страна зовет, нас районная газета ждет» і ўсе мы падхопліваем яго.**



Мяне на тую камісію запрашаюць у ліку першых. Я ўжо журналісцкую працу крыху зведала. Была на практыцы ў бабруйскай газеце, у «Калгаснай праўдзе» (зараз гэта «Беларуская ніва»), у «Знамени юности». Рэдактары дзвюх апошніх газет запрашалі мяне пасля заканчэння вучобы прыходзіць у іх калектывы. Успрыняла я гэта як жэст ветлівасці. Мне, члену камітэта камсамола ўніверсітэта, чапляцца за Мінск?! На пытанне, дзе б я хацела працаваць, бадзёра адказала: «Там, куды накіруе радзіма». «Вы ўсё-такі ўдакладніце, — здзіўлена глянуў на мяне Цітавец, — як выдатніца вучобы, вы маеце права выбіраць». У маёй галаве маланкай пранеслася думка: праз родныя мае Цімкавічы (гэта ў Капыльскім раёне Мінскай вобласці) ходзіць на Гродна цягнік з Магілёва, значыць, будзе проста дабірацца дадому, да бацькоў.

— Я выбіраю Магілёўшчыну!..

— Калі так, то добра, — адказаў Цітавец, — там, дарэчы, ёсць вакансіі ў раённых газетах Мсціслава, Шклова і Клімавічаў. Куды канкрэтна паедзеце — вырашаць на месцы ў Магілёве.

...Аказалася, что вакансія была яшчэ і ў абласной газеце «Магілёўская праўда», куды мяне і накіравалі літсупрацоўнікам. Забягаючы наперад, скажу, што праз некаторы час рэдакцыю ўзначаліў той самы Васіль Яфімавіч Цітавец, з якім мы потым адпрацавалі тут некалькі гадоў. Ён — галоўным рэдактарам, я — яго першым намеснікам, да таго яшчэ і старшыней Магілёўскага аддзялення Саюза журналістаў Беларусі. Калі мяне пераводзілі ў Мінск на пасаду галоўнага рэдактара часопіса «Работніца і сялянка», магілёўскія журналісты выпусцілі рукапісную газету — на вялікі аркуш ватмана наклеілі мой фотаздымак, побач кожны напісаў сваё пажаданне. Міша Гарадзецкі намаляваў лесвіцу, на першай прыступцы якой сядзеў худы «літраб», а вышэй на прыступках значылася «галоўрэд», «Вярхоўны Савет» і на самым версе нават «ААН». Фантастыка! Але дзіўна: усе гэтыя прыступкі я прайшла. Вось якія крылы дала Магілёўшчына!

На той час «Магілёўская праўда» была адзінай вялікай мясцовай газетай у вобласці і горадзе. Можна сказаць, што яна з'яўлялася асяродкам духоўнасці. Тут працавалі вядомыя пісьменнікі Аляксей Пысін, Васіль Матэвушаў, Іван Аношкін, бліскучыя журналісты Алесь Луцкі, Якаў Рэзнікаў, Леанціна Каліноўская, Міхась Гарадзецкі, Вацлаў Гільбурд. Тут збіраліся мастакі, артысты, выкладчыкі інстытутаў, ветэраны вайны і героі працы, літаратурныя пачаткоўцы, як бы цяпер сказалі — увесь магілёўскі бамонд. Колькі разумнага і добрага ўзяла я ад іх...

А бясконцыя журналісцкія камандзіроўкі па Магілёўшчыне! «Трое суток шагать, трое суток не спать ради нескольких строчек в газете» было не толькі песняй, але і рэальнасцю. Ішлі 50—60-я гады, яшчэ там і сям зеўралі раны вайны, яшчэ не хапала транспарту і толькі ў райцэнтры хадзілі аўтобусы-развалюхі. Даедзеш да таго райцэнтра, а далей ногі ў рукі — і пайшоў. Можна сказаць, што я пешкі абхадзіла ўсю Магілёўшчыну. І адкрывала для сябе дзівосны край — край аратых і мысліцеляў, вучоных і асветнікаў, дойлідаў і змагароў за свабоду і лепшую долю для свайго народа.

Стаяла на Дзявочай гары старажытнага Мсціслава, углядалася ў яго храмы, шукала след аднаго з нашых славутых першадрукароў Пятра Мсціслаўца, які і ў Маскве быў першым, а потым разам з Іванам Фёдаравым у 1569 годзе стварыў друкарню ў Заблудаве, дзе надрукавалі «Евангелле вучыцельнае» і «Псалтыр з Часаслоўцам».

У Быхаўскім раёне хадзіла па хатах старажылаў вёскі Баркалабава, збірала іхнія ўспаміны, потым, усхваляваная, стаяла на маляўнічым беразе Дняпра ля развалін манастыра, дзе быў калісьці знойдзены славуты пісьмовы помнік XVI стагоддзя — Баркалабаўскі летапіс — і захоўвалася вядомая Баркалабаўская ікона Божай маці.

А якія цікавыя старонкі жыцця гартала я, наведваючы Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію, гісторыя якой пачалася ў 1840 годзе з Горы-Горацкай земляробчай школы; трэцюю магілёўскую школу — былую мужчынскую гімназію, у якой калісьці вучыліся Мікалай Судзілоўскі — рэвалюцыянер, вучоны, публіцыст, падарожнік, які быў нават прэзідэнтам Гавайскіх астравоў, і Ота Шміт — таксама слынны вучоны і падарожнік, кіраўнік знакамітай навуковай экспедыцыі на параходзе «Чалюскін».

Хадзіла я па бялыніцкай зямлі, углядалася ў яе цудоўныя краявіды, якія сёння можна пабачыць на палотнах вядомага мастака Бялыніцкага-Бірулі ў музеях Магілёва і Мінска. Два дні правяла ў вёсцы Саматэвічы Касцюковіцкага раёна, рыхтуючы матэрыялы да нарыса пра ўраджэнца гэтай вёскі, народнага паэта Беларусі Аркадзя Куляшова. Дарэчы, і Куляшоў, і іншыя вядомыя пісьменнікі-землякі — Пятро Прыходзька, Аляксей Русецкі, Эдуард Валасевіч, Сцяпан Гаўрусёў, Іван Чыгрынаў, Віктар Карамазаў часта наведваліся ў мясцовыя працоўныя калектывы, школы і дамы культуры і абавязкова да нас у рэдакцыю.

Тэматыка Вялікай Айчынай вайны ўвогуле ніколі не сыходзіла са старонак нашай газеты. Мы з калегамі рыхтавалі ўспаміны ветэранаў вайны, якія потым выйшлі асобнай кнігай «Салдатамі былі ўсе». Я пісала рэпартажы з месца стварэння музея савецка-польскай баявой садружнасці ля вёскі Леніна Горацкага раёна. Неаднойчы бывала на Буйніцкім полі пад Магілёвам, пра якое даведалася яшчэ студэнткай, беручы інтэрв`ю ў пісьменніка Канстанціна Сіманава. Ён, сведка гераічнай абароны Магілёва ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, прыязджаў у Беларусь для збору матэрыялаў для кнігі «Жывыя і мёртвыя» і завітаў у БДУ. Як вядома, свой прах Сіманаў завяшчаў развеяць над Буйніцкім полем. А цяпер гэтае поле — хвалюючы мемарыял героям мінулай вайны.

...Гартаю старыя блакноты. Запісы аб сустрэчах з механізатарамі, даяркамі, будаўнікамі, урачамі, настаўнікамі, старшынямі калгасаў. Вось незвычайны запіс: «Зайшоў у кабінет Кірыла Арлоўскі. Ледзь павітаўшыся, спытаў, ці ведаю я, рэдактарка, колькі насення морквы патрэбна на гектар пашы. Я сарамліва прызналася, што не ведаю. Чатыры кілаграмы,— удакладніў Арлоўскі, — а ў мяне ў калгасе чатырыста кілаграмаў ляжыць, быццам яно і не патрэбна «Сортсемовощу». Набяры мне тэлефон гэтага «овошча». (Як вядома, Герой Савецкага Саюза і Герой Сацыялістычнай Працы Кірыла Пракопавіч Арлоўскі не меў абедвюх рук). Даўшы добры наганяй «ававшчу», Арлоўскі прысеў, паклаў кульці на стол, загадаў: «Будзем пісаць карэспандэнцыю «Восень у «Рассвеце» і пачаў дыктаваць. Я ледзь паспявала запісваць. Назаўтра «Восень у «Рассвеце» красавалася на першай паласе газеты.

Кароценькі запіс: «Гусарыкі» з Харошак». Быў у мяне такі нарыс пра самадзейных артыстаў з вёскі Харошкі ля Магілёва, якія на рэспубліканскім аглядзе цудоўна выканалі танец «Гусарыкі». І былі новыя знаёмыя — маладыя выпускнікі ленінградскай вучэльні Валянціна Гаявая і Мікалай Дудчанка прыехалі працаваць у Дом культуры Магілёўскага аўтазавода. Нас з мужам яны запрасілі на наваселле. Сціплы пакойчык. Дзве раскладушкі, сякая-такая закусь на табурэце. Гэта было самае вясёлае наваселле з усіх, на якіх я пабывала. І менавіта тады, у Магілёве, пачаў свой шлях знакаміты сёння на ўвесь свет музычна-харэаграфічны ансамбль «Харошкі» на чале з народнай артысткай Беларусі Валянцінай Іванаўнай Гаявой.

Ёсць і непрыемны запіс. Як тагачасны рэдактар абласной газеты І.П. Крыскавец загадаў мне, учарашняй студэнтцы, напісаць паклёп на паэта Пастарнака. Пасля публікацыі за мяжой рамана «Доктар Жывага» (якога ніхто не бачыў і не чытаў) усе савецкія газеты стракацелі такімі паклёпамі. Я чытала тую пісаніну, але сама пісаць адмовілася — маўляў, нам ва ўніверсітэце пра такіх паэтаў, як Ясенін або Пастарнак, нічога не расказвалі, быццам іх і не было. Тады мяне пазбавілі прэміяльных і доўгі час рэдактар сваю новую літсупрацоўніцу нібы і не заўважаў.

Яшчэ адзін сумны запіс: «Ліпень 1957 года. Капцы маёй ратушы». А было так. Справіўшы вяселле, перабралася я да мужа ў яго пакой у невялікім двухпавярховым доме на Савецкай плошчы, якую даўней называлі «Гандлёвая» або «Вал», бо яна — у старажытным цэнтры Магілёва, на высокім беразе Дняпра. Дом наш быў, лічу, архітэктурным здабыткам горада, як і ўсе астатнія дамы-палацы наўкола. Тут даўней месціліся губернскія ўлады і духавенства, бывалі цары (Кацярына Другая і Мікалай Другі), усялякія вяльможы і іншая знаць, тоўкся работны люд. Тут грымела рэвалюцыя і насмерць стаялі амаль увесь ліпень 1941 года гераічныя абаронцы Магілёва. Цяпер дамы былі абшарпаныя, са шрамамі вайны, а ўсе двары забудаваны хлеўчукамі і куратнікамі. Ды было тут для мяне дзіва: павернеш за вугал дома і праз некалькі метраў — Магілёўская ратуша. Таксама абшарпаная часам і вайной, без шпіля і купала, без вокнаў і дзвярэй. Вакол раслі палын, дзядоўнік і іншае пустазелле. Аднойчы я прылегла на траву, загледзелася на ратушу, якая стаяла тут з XVII стагоддзя, на аблокі, што плылі і плылі, нібы тыя стагоддзі, невядома куды. Раптам ускочыла, пабегла ў свой пакойчык і на адным дыханні напісала абразок «Раскажы, ратуша...» Прынесла ў рэдакцыю. Загадчык аддзела прачытаў, скрывіўся: «Каму патрэбна такая старызна? Выкінь».

Неяк мы пайшлі ў кіно на апошні сеанс. А дванаццатай гадзіне вярталася, а наш дом, ратуша і іншыя суседнія пабудовы акружаны салдатамі і нас не пускаюць. Раптам нешта як шуганула, загуло, у неба ўзняўся вялізны слуп пылу і немым галасам закрычалі перапалоханыя птушкі. Калі пыл крыху рассеяўся, мы не ўбачылі нашай ратушы. «Цяпер ідзіце», — сказалі салдаты. Мы пабеглі на руіны, дзе пыл яшчэ не ўлёгся. Муж рады быў, што не ўзарвалі і наш дом, а я стаяла і плакала.

Таго дома даўно няма. А ратушу, кажуць, хочуць аднавіць. Дай Бог!

У старых блакнотах шмат запісаў са Шклоўскага раёна. Гісторыя горада на Дняпры, вядомага з XVI стагоддзя, захапляльная. Спрадвеку тут жылі (і жывуць сёння!) працавітыя, таленавітыя, гасцінныя месцічы. Ткалі лён і шоўк, выраблялі паперу, гадзіннікі, выступалі на сцэне прыгоннага тэатра графа Зорыча, ігралі ў славутым аркестры. Ды так, што самадзейных артыстаў забралі аж у Маскву. А які парк у Шклове! Калісьці я часцяком ездзіла туды да сяброўкі-аднакурсніцы Аляксандры Захарэнка, якую «размеркавалі» у шклоўскую райгазету, і мы бегалі на танцы ў гэты парк, дзе граў духавы аркестр.

Пішу гэтыя радкі, ведаючы: восень сёлета пачнецца ў Шклове з вялікага нашага свята — Дня беларускага пісьменства. Яшчэ больш папрыгажэе гэты горад, які пасля праведзеных тут рэспубліканскіх «Дажынак» аднавіўся. Заззяў, нібы лялечка. Спадзяюся маршрутам навукова-асветнай экспедыцыі «Дарога да святыняў», прымеркаванай да свята беларускага пісьменства, прыехаць сюды і я. На схіле гадоў яшчэ раз пакланіцца сваёй журналісцкай калысцы, сказаць шчыры дзякуй за ўсё старажытнаму і заўжды маладому любаму магілёўскаму краю.

**Марыя КАРПЕНКА,**
**Заслужаны работнік культуры Рэспублікі Беларусь.**

